Нацыянальны інстытут адукацыі

Кантрольна-вымяральныя матэрыялы

В. В. Гінчук

# Гісторыя Беларусі

## Тэставыя і рознаўзроўневыя заданні

## 10–11 класы

Дапаможнік для настаўнікаў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання

*Рэкамендавана Навукова-метадычнай установай «Нацыянальны інстытут адукацыі» Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь*

Мінск
«Сэр-Вит»
2012

УДК 373.5.016:94(476)
ББК 74.266.3
Г49

Серыя заснавана ў 2011 годзе

Рэцэнзенты:
лабараторыя сацыякультурнай адукацыі Навукова-метадычнай установы «Нацыянальны інстытут адукацыі» Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь;
настаўнік гісторыі і грамадазнаўства вышэйшай катэгорыі дзяржаўнай установы адукацыі «Гімназія № 24 г. Мінска» *І. Г. Драгавоз*

**Гінчук, В. В.**
Г49 Гісторыя Беларусі: тэставыя і рознаўзроўневыя заданні: 10–11 кл.: дапаможнік для настаўнікаў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі з белар. і рус. мовамі навучання / В. В. Гінчук. – Мінск : Сэр-Вит, 2012. – 112 с. – (Кантрольна-вымяральныя матэрыялы).
ISBN 978-985-419-665-7.

У дапаможніку прапанаваны тэставыя і рознаўзроўневыя заданні для правядзення прамежкавага і выніковага кантролю па гісторыі Беларусі ў Х–ХІ класах. Дапаможнік адрасаваны настаўнікам гісторыі ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі.

**УДК 373.5.016:94(476)**
**ББК 74.266.3**

**ISBN 978-985-419-665-7**

© Национальный институт образования, 2012
© Оформление. ООО «Сэр-Вит», 2012

# Рэкамендацыі па выкарыстанні заданняў для прамежкавага і выніковага кантролю па гісторыі Беларусі ў X – XI класах

Сістэматычны кантроль вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў з'яўляецца важнай умовай якасці адукацыі. Нарматыўныя дакументы для ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі прадугледжваюць правядзенне паўрочнага, прамежкавага і выніковага кантролю вучэбных дасягненняў вучняў.

Вышэйназваныя віды кантролю адрозніваюцца:

аб'ёмам вучэбнага матэрыялу, які з'яўляецца аб'ектам кантролю (паўрочны кантроль – матэрыял аднаго ўрока; прамежкавы кантроль – матэрыял раздзела, выніковы кантроль – матэрыял курса, які вывучаўся ў навучальным годзе);

узроўнем абагульнення і сістэматызацыі вучэбнага матэрыялу, які патрабуецца для выканання заданняў.

У дапаможніку прапанаваны тэставыя і рознаўзроўневыя заданні для правядзення прамежкавага і выніковага кантролю па гісторыі Беларусі ў X–XI класах. Заданні структураваны па раздзелах, асобна прадстаўлены заданні для выніковага кантролю.

Унутры раздзела тэставыя заданні структураваны па відах дзейнасці:

- выбар аднаго правільнага адказу;
- выбар некалькіх правільных адказаў;
- суаднясенне элементаў двух мностваў (дат і падзей, тэрмінаў і іх азначэнняў, прозвішчаў гістарычных асоб і іх характарыстык і інш.);
- расстаноўка гістарычных фактаў у правільнай храналагічнай паслядоўнасці;
- лакалізацыя гістарычных падзей на карце;
- свабодны кароткі адказ (запіс гістарычнага тэрміна, прозвішча гістарычнага дзеяча і інш.).

Звяртаем увагу настаўнікаў на тое, што засваенне таго ці іншага элемента зместу вучэбнага прадмету можна праверыць рознымі відамі тэставых заданняў. Напрыклад, веды вучняў аб першым прымяненні рэактыўных установак «кацюша» у гады Вялікай Айчыннай вайны могуць быць правераны тэставымі заданнямі на выбар пра-

вільнага адказу; свабодным кароткім адказам (запіс даты, назвы горада, прозвішча камандзіра); заданнем на лакалізацыю гістарычных падзей на карце; уключэннем гэтага гістарычнага факта ў тэставае заданне на суаднясенне элементаў двух мностваў або ў заданне на расстаноўку гістарычных падзей у правільнай храналагічнай паслядоўнасці. У дапаможніку прапанаваны розныя варыянты тэставых заданняў з адным і тым жа гістарычным фактам.

Прапанаваныя тэставыя і рознаўзроўневыя заданні рэкамендуецца разглядаць як банк заданняў, з якога настаўнік па сваім меркаванні можа фарміраваць праверачныя работы (для пісьмовага кантролю вучэбных дасягненняў вучняў), а таксама выбіраць заданні для правядзення вуснага кантролю.

Праверачныя работы для правядзення прамежкавага або выніковага кантролю могуць быць сфарміраваны з выкарыстаннем тэставых і рознаўзроўневых заданняў. Для таго каб пры правядзенні кантролю вучні мелі магчымасць атрымаць вышэйшую адзнаку «10», праверачная работа павінна ўключаць заданні пяці ўзроўняў. Яна можа быць сфарміравана з пяці рознаўзроўневых заданняў адпаведнага раздзелу дапаможніка. Звяртаем увагу настаўнікаў на тое, што асобныя рознаўзроўневыя заданні (якія маюць у сваім складзе пункты: 1.1, 1.2, 1.3 і г.д.) могуць быць падзелены паміж вучнямі на некалькі варыянтаў.

Пры фарміраванні праверачных работ у якасці заданняў першага–чацвёртага ўзроўняў могуць выкарыстоўвацца таксама тэставыя заданні. Пры гэтым трэба мець на ўвазе, што тэставыя заданні на выбар аднаго або некалькіх правільных адказаў, у якіх патрабуецца пазнаць вывучаны гістарычны матэрыял, адпавядаюць першаму ўзроўню засваення вучэбнага матэрыялу (у праверачную работу рэкамендуецца ўключаць адно заданне на выбар некалькіх правільных адказаў або два заданні на выбар аднаго правільнага адказу). Заданні на свабодны кароткі адказ, якія патрабуюць аднаўлення ў памяці і запісу гістарычнага тэрміна або прозвішча гістарычнага дзеяча, адпавядаюць другому ўзроўню засваення вучэбнага матэрыялу. Тэставыя заданні на суаднясенне элементаў двух мностваў адпавядаюць трэцяму ўзроўню; а заданні на расстаноўку гістарычных фактаў у пра-

вільнай храналагічнай паслядоўнасці або лакалізацыю гістарычных падзей на карце – чацвёртаму.

Колькасць прапанаваных у дапаможніку тэставых і рознаўзроўневых заданняў дазваляе рэалізаваць індывідуальны падыход да правядзення прамежкавага і выніковага кантролю вучэбных дасягненняў вучняў.

# X КЛАС
# Гісторыя Беларусі: 1917–1945 гг.

## ТЭСТАВЫЯ ЗАДАННІ

### Раздзел 1. Кастрычніцкая рэвалюцыя. Стварэнне беларускай дзяржаўнасці

*Выберыце правільны адказ:*

**1.** Восенню 1917 г. тэрыторыя Беларусі падзялялася на дзве часткі лініяй фронту, якая праходзіла:

а) праз Дзвінск – Баранавічы – Пінск;
б) па р. Бярэзіна;
в) па р. Днепр;
г) праз Полацк – Магілёў – Гомель.

**2.** Стаўка Вярхоўнага галоўнакамандуючага рускай арміяй восенню 1917 г. знаходзілася ў:

а) г. Баранавічы;
б) г. Мінску;
в) г. Магілёве;
г) г. Смаленску.

**3.** Выканкам Мінскага Савета абвясціў аб пераходзе ўлады ў Мінску ў рукі Савета рабочых і салдацкіх дэпутатаў:

а) 24 кастрычніка 1917 г.;
б) 25 кастрычніка 1917 г.;
в) 24 кастрычніка 1918 г.;
г) 25 кастрычніка 1918 г.

**4.** Кіраўніком Ваенна-рэвалюцыйнага камітэта (ВРК) Заходняга фронту, створанага 27 кастрычніка 1917 г., з'яўляўся:

а) К. Ландар;
б) А. Мяснікоў;
в) З. Жылуновіч;
г) М. Галадзед.

**5.** У Магілёве Савецкая ўлада была ўстаноўлена:

а) 25 кастрычніка 1917 г.;
б) 2 лістапада 1917 г.;
в) 20 лістапада 1917 г.;
г) 20 лістапада 1918 г.

**6.** Устанаўленне Савецкай улады ў Магілёве звязана з:

а) прыбыццём браняпоезда з Заходняга фронту пад камандаваннем бальшавіка У. Пралыгіна;
б) роспускам Камітэта выратавання рэвалюцыі;

в) ліквідацыяй контррэвалюцыйнай Стаўкі Вярхоўнага галоўнакамандуючага;
г) прыбыццём з Заходняга фронту Каўказскай дывізіі.

7. Вышэйшы заканадаўчы орган Савецкай улады, створаны на тэрыторыі Беларусі ў лістападзе 1917 г., называўся:

а) Ваенна-рэвалюцыйны камітэт (ВРК) Заходняга фронту;
б) Абласны выканаўчы камітэт Саветаў рабочых, салдацкіх і сялянскіх дэпутатаў Заходняй вобласці і фронту (Аблвыканкамзах);
в) Паўночна-Заходні абласны камітэт РСДРП(б);
г) Савет Народных Камісараў (СНК) Заходняй вобласці і фронту;

8. Выканаўчым органам Савецкай улады на тэрыторыі Беларусі ў лістападзе 1917 г. з'яўляўся:

а) Ваенна-рэвалюцыйны камітэт (ВРК) Заходняга фронту;
б) Абласны выканаўчы камітэт Саветаў рабочых, салдацкіх і сялянскіх дэпутатаў Заходняй вобласці і фронту (Аблвыканкамзах);
в) Паўночна-Заходні абласны камітэт РСДРП(б);
г) Савет Народных Камісараў (СНК) Заходняй вобласці і фронту.

9. Старшынёй Паўночна-Заходняга абласнога камітэта РСДРП(б) у 1917 г. быў:

а) К. Ландар;
б) А. Мяснікоў;
в) З. Жылуновіч;
г) М. Галадзед.

10. Мірны дагавор паміж Савецкай Расіяй і Германіяй быў падпісаны:

а) 9 снежня 1917 г.;
б) 18 лютага 1918 г.;
в) 21 лютага 1918 г.;
г) 3 сакавіка 1918 г.

11. Мірны дагавор паміж Савецкай Расіяй і Германіяй, падпісаны 3 сакавіка 1918 г., называўся:

а) Брэсцкі;
б) Версальскі;
в) Рыжскі;
г) Венскі.

12. Днём нараджэння Чырвонай Арміі лічыцца:

а) 25 кастрычніка 1917 г.;
б) 18 лютага 1918 г.;
в) 23 лютага 1918 г.;
г) 3 сакавіка 1918 г.

13. I Усебеларускі з'езд адбыўся:

а) 25 кастрычніка 1917 г.;
б) 15–18 лістапада 1917 г.;
в) 15–18 снежня 1917 г.;
г) 20–27 лістапада 1918 г.

**14.** На I Усебеларускім з'ездзе вырашалася пытанне аб:

а) заключэнні мірнага дагавора з Германіяй;
б) стварэнні Усебеларускага Савета сялянскіх, рабочых і салдацкіх дэпутатаў;
в) вывадзе германскіх войск з тэрыторыі Беларусі;
г) прыняцці Канстытуцыі Беларусі.

**15.** Першая Устаўная грамата Выканкама Рады Усебеларускага з'езда была прынята:

а) 18 лютага 1918 г.;
б) 21 лютага 1918 г.;
в) 3 сакавіка 1918 г.;
г) 9 сакавіка 1918 г.

**16.** У Першай Устаўной грамаце Выканкама Рады Усебеларускага з'езда:

а) Беларусь была абвешчана Народнай рэспублікай;
б) Выканкам абвясціў сябе ўладай у Беларусі;
в) была абвешчана незалежнасць БНР;
г) замацоўваліся ўмовы Брэсцкага міру.

**17.** Другая Устаўная грамата Выканкама Рады Усебеларускага з'езда была прынята:

а) 18 лютага 1918 г.;
б) 21 лютага 1918 г.;
в) 9 сакавіка 1918 г.;
г) 25 сакавіка 1918 г.

**18.** У Другой Устаўной грамаце Выканкама Рады Усебеларускага з'езда:

а) Беларусь была абвешчана Народнай рэспублікай;
б) Выканкам абвясціў сябе ўладай у Беларусі;
в) была абвешчана незалежнасць БНР;
г) замацоўваліся ўмовы Брэсцкага міру.

**19.** Трэцяя Устаўная грамата Рады БНР была прынята:

а) 18 лютага 1918 г.;
б) 21 лютага 1918 г.;
в) 9 сакавіка 1918 г.;
г) 25 сакавіка 1918 г.

**20.** У Трэцяй Устаўной грамаце Рады БНР:

а) Беларусь была абвешчана Народнай рэспублікай;
б) Выканкам абвясціў сябе ўладай у Беларусі;
в) была абвешчана незалежнасць БНР у этнаграфічных межах пражывання беларусаў;
г) замацоўваліся ўмовы Брэсцкага міру.

**21.** Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка Беларусь (ССРБ) была абвешчана:

а) 30 снежня 1918 г.;
б) 31 студзеня 1918 г.;
в) 1 студзеня 1919 г.;
г) 16 студзеня 1919 г.

**22.** VI Паўночна-Заходняя абласная канферэнцыя РКП(б) адбылася:

а) 30–31 снежня 1918 г.;
б) 30–31 студзеня 1918 г.;
в) 2–3 лютага 1919 г.;
г) 16 студзеня 1919 г.

**23.** Першым кіраўніком Часовага рабоча-сялянскага савецкага ўрада Беларусі быў:

а) А. Мяснікоў;
б) З. Жылуновіч;
в) М. Рагазінскі;
г) В. Ластоўскі.

**24.** Рашэнне аб уключэнні Віцебскай, Магілёўскай, Смаленскай губерняў у склад РСФСР было прынята:

а) 1 студзеня 1919 г.;
б) 16 студзеня 1919 г.;
в) 2–3 лютага 1919 г.;
г) 27 лютага 1919 г.

**25.** I Усебеларускі з'езд Саветаў адбыўся:

а) 15–18 снежня 1917 г.;
б) 16 студзеня 1919 г.;
в) 2–3 лютага 1919 г.;
г) 27 лютага 1919 г.

**26.** Рашэнне аб аб'яднанні ССРБ і Літоўскай ССР было прынята на:

а) I Усебеларускім з'ездзе;
б) I Усебеларускім з'ездзе Саветаў;
в) I з'ездзе КПБ(б);
г) VI Паўночна-Заходняй абласной канферэнцыі РКП(б).

**27.** Першая Канстытуцыя ССРБ была прынята на:

а) I Усебеларускім з'ездзе;
б) I Усебеларускім з'ездзе Саветаў;
в) I з'ездзе КПБ(б);
г) VI Паўночна-Заходняй абласной канферэнцыі РКП(б).

**28.** Мірны дагавор паміж Савецкай Расіяй, Польшчай і Украінай быў падпісаны:

а) 3 сакавіка 1918 г.;
б) 9 сакавіка 1918 г.;
в) 31 ліпеня 1920 г.;
г) 18 сакавіка 1921 г.

**29.** Мірны дагавор паміж Савецкай Расіяй, Польшчай і Украінай, падпісаны 18 сакавіка 1921 г., называўся:

а) Брэсцкі;
б) Версальскі;
в) Рыжскі;
г) Венскі.

**30.** Дэкларацыя аб абвяшчэнні незалежнасці Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі Беларусі была прынята:

а) 1 студзеня 1919 г.;
б) 2–3 лютага 1920 г.;
в) 31 ліпеня 1920 г.;
г) 18 сакавіка 1921 г.

**31.** Пасля вызвалення ад польскіх інтэрвентаў Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка Беларусь аднаўлялася ў межах:

а) Віцебскай, Магілёўскай, Смаленскай губерняў;
б) шасці паветаў Мінскай губерні;
в) Мінскай, Гродзенскай губерняў;
г) Віцебскай, Магілёўскай, Смаленскай, Мінскай, Гродзенскай губерняў.

**32.** У гістарычнай літаратуры назву «лінія Керзана» атрымала лінія:

а) Дзвінск – Паставы – Баранавічы – Пінск;
б) Гродна – Ялаўка – Няміраў – Брэст-Літоўск;
в) Полацк – Орша – Магілёў – Гомель;
г) Полацк – Мінск – Слуцк – Брэст.

**33.** Згодна з Рыжскім мірным дагаворам да Польшчы адышла тэрыторыя:

а) Віцебскай і Магілёўскай губерняў;
б) Заходняй Беларусі;
в) Мінскай губерні;
г) на поўдзень ад р. Бярэзіна.

*Выберыце правільныя адказы:*

**34.** Да першых мерапрыемстваў бальшавікоў у Беларусі адносіліся:

а) нацыяналізацыя банкаў і прамысловасці;
б) увядзенне 8-гадзіннага рабочага дня;
в) увядзенне ўсеагульнага пачатковага навучання;
г) індустрыялізацыя.

**35.** Да першых мерапрыемстваў бальшавікоў у Беларусі адносіліся:

а) перавод усіх школ на беларускую мову навучання;
б) увядзенне 8-гадзіннага рабочага дня;

в) канфіскацыя памешчыцкіх гаспадарак;
г) індустрыялізацыя.

**36.** Да першых мерапрыемстваў бальшавікоў у Беларусі адносіліся:

а) увядзенне рабочага кантролю над вытворчасцю;
б) стварэнне калектыўных сялянскіх гаспадарак;
в) увядзенне усеагульнай сярэдняй адукацыі;
г) перасяленне сялян на хутары.

**37.** VI Паўночна-Заходняя абласная канферэнцыя РКП(б):

а) прыняла рашэнне аб абвяшчэнні ССРБ;
б) абвясціла сябе I з'ездам КПБ(б);
в) прыняла Канстытуцыю ССРБ;
г) прыняла рашэнне аб утварэнні Літбел.

**38.** Польскі акупацыйны рэжым на тэрыторыі Беларусі характарызаваўся:

а) вывазам прыродных багаццяў Беларусі ў Польшчу;
б) абвяшчэннем польскай мовы дзяржаўнай;
в) адкрыццём беларускіх школ і ўстаноў культуры;
г) абвяшчэннем незалежнасці беларускіх зямель;

**39.** Польскі акупацыйны рэжым на тэрыторыі Беларусі характарызаваўся:

а) закрыццём беларускіх школ і ўстаноў культуры;
б) звальненнем з дзяржаўных устаноў асоб беларускага паходжання і праваслаўнага веравызнання;
в) абвяшчэннем беларускай мовы дзяржаўнай;
г) дазволам дзеячам беларускага нацыянальнага руху займаць дзяржаўныя пасады.

**40.** Прычынамі паражэння Чырвонай Арміі пад Варшавай у жніўні 1920 г. з'яўляліся:

а) значная ваенная і дыпламатычная падтрымка Польшчы з боку Англіі, Францыі, Італіі і ЗША;
б) занятасць асноўных сіл Чырвонай Арміі на Усходнім фронце ў барацьбе супраць Калчака;
в) магутны нацыянальна-патрыятычны ўздым польскага народа ў абарону сваёй радзімы;
г) абяцанне Ю. Пілсудскага прызнаць незалежнасць Беларусі.

**41.** Прычынамі паражэння Чырвонай Арміі пад Варшавай у жніўні 1920 г. з’яўляліся:

а) рэвалюцыйны ўздым народаў Англіі, Францыі, Італіі і ЗША;
б) вялікія страты Чырвонай Арміі;
в) магутны нацыянальна-патрыятычны ўздым польскага народа ў абарону сваёй радзімы;
г) абяцанне Ю. Пілсудскага прызнаць незалежнасць Беларусі.

**42.** Элементамі палітыкі «ваеннага камунізму» з’яўляліся:

а) грашовая рэформа;
б) нацыяналізацыя прадпрыемстваў;
в) харчразвёрстка;
г) забарона прыватнага гандлю.

**43.** Элементамі палітыкі «ваеннага камунізму» з’яўляліся:

а) цэнтралізацыя кіраўніцтва прамысловай вытворчасцю;
б) увядзенне дзяржаўнай хлебнай манаполіі;
в) дазвол найму рабочай сілы;
г) картачная сістэма забеспячэння насельніцтва таварамі.

**44.** Элементамі палітыкі «ваеннага камунізму» з’яўляліся:

а) усеагульная працоўная павіннасць;
б) развіццё кааперацыі і арэнды;
в) ураўняльнасць у аплаце працы;
г) бясплатнасць камунальных паслуг.

**45.** Вызначце элементы праграмных патрабаванняў бальшавікоў і Беларускай сацыялістычнай грамады ў верасні 1917 г.

| | |
|---|---|
| 1) БСГ | а) сацыялістычная рэвалюцыя, пераход усёй улады да Саветаў |
| 2) Бальшавікі | б) аўтаномія Беларусі ў складзе Расійскай дэмакратычнай рэспублікі |
| | в) вырашэнне зямельнага пытання «краявым сеймам аўтаномнай Беларусі» |
| | г) канфіскацыя і нацыяналізацыя памешчыцкіх зямель |

*Суаднясіце элементы двух мностваў:*

**46.**

| | |
|---|---|
| 1) К. Ландар | а) старшыня Паўночна-Заходняга абласнога камітэта РСДРП(б) |
| 2) А. Мяснікоў | б) старшыня Аблвыканкамзаха |

| | |
|---|---|
| 3) М. Рагазінскі | в) старшыня Савета Народных Камісараў (СНК) Заходняй вобласці і фронту |
| 4) М. Крыленка | г) Вярхоўны галоўнакамандуючы Заходнім фронтам |

**47.**

| | |
|---|---|
| 1) I Усебеларускі з’езд | а) абвяшчэнне пераходу ўлады ў Беларусі да Выканкама Рады Усебеларускага з’езда |
| 2) I Устаўная грамата Выканкама Рады Усебеларускага з’езда | б) стварэнне Усебеларускага Савета сялянскіх, рабочых і салдацкіх дэпутатаў |
| 3) II Устаўная грамата Выканкама Рады Усебеларускага з’езда | в) абвяшчэнне незалежнасці БНР |
| 4) III Устаўная грамата Рады БНР | г) абвяшчэнне БНР |

**48.**

| | |
|---|---|
| 1) 15–18 снежня 1917 г. | а) I Устаўная грамата Выканкама Рады Усебеларускага з’езда |
| 2) 21 лютага 1918 г. | б) II Устаўная грамата Выканкама Рады Усебеларускага з’езда |
| 3) 9 сакавіка 1918 г. | в) III Устаўная грамата Рады БНР |
| 4) 25 сакавіка 1918 г. | г) стварэнне Выканкама Рады Усебеларускага з’езда |

**49.**

| | |
|---|---|
| 1) 9 сакавіка 1918 г. | а) абвяшчэнне ССРБ |
| 2) 1 студзеня 1919 г. | б) рашэнне аб аб’яднанні ССРБ і Літоўскай ССР |
| 3) 16 студзеня 1919 г. | в) рашэнне аб уключэнні Віцебскай, Магілёўскай і Смаленскай губерняў у склад РСФСР |
| 4) 2–3 лютага 1919 г. | г) абвяшчэнне БНР |

**50.**

| | |
|---|---|
| 1) 1 студзеня 1919 г. | а) рашэнне аб уключэнні Віцебскай, Магілёўскай і Смаленскай губерняў у склад РСФСР |
| 2) 16 студзеня 1919 г. | б) вызваленне Мінска ад польскіх інтэрвентаў |
| 3) 11 ліпеня 1920 г. | в) абвяшчэнне ССРБ |
| 4) 18 сакавіка 1921 г. | г) далучэнне Гродзенскай губерні, заходніх раёнаў Мінскай і, усходніх раёнаў Віленскай губерні да Польшчы |

*Запішыце назвы гістарычных тэрмінаў:*

**51.** Рост уплыву бальшавікоў на народныя масы, які суправаджаўся павелічэннем іх прадстаўніцтва ў Саветах рабочых, салдацкіх і сялянскіх дэпутатаў, называўся …

**52.** Самастойнае ажыццяўленне дзяржаўнай улады або шырокае ўнутранае самакіраванне, якое прадастаўляецца народу, што кампактна пражывае ў межах дзяржавы, называецца …

**53.** Карэнныя змяненні ў грамадска-палітычным жыцці, змена старога дзяржаўнага ладу новым называецца …

**54.** Пераход зямлі, прадпрыемстваў, іншых сродкаў вытворчасці з прыватнай уласнасці ў дзяржаўную называецца …

**55.** Прымусовае далучэнне адной дзяржавай тэрыторыі другой дзяржавы называецца …

**56.** Грошы або матэрыяльныя каштоўнасці, якія дзяржава-пераможца атрымлівае з краіны, што пацярпела паражэнне ў вайне, называюцца …

**57.** Захоп войскамі адной дзяржавы тэрыторыі або часткі тэрыторыі іншай дзяржавы, які суправаджаецца ўсталяваннем уласнай адміністрацыі і законаў, называецца …

**58.** Гвалтоўнае ўмяшальніцтва адной або некалькіх дзяржаў ва ўнутраныя справы другой дзяржавы называецца …

**59.** Элемент палітыкі «ваеннага камунізму», сістэма нарыхтовак сельскагаспадарчай прадукцыі, згодна з якой сяляне абавязаны былі здаваць дзяржаве ўсе лішкі прадукцыі, называецца …

*Пастаўце ў правільнай храналагічнай паслядоўнасці гістарычныя падзеі:*

**60.** а) II Усерасійскі з’езд Саветаў рабочых і салдацкіх дэпутатаў; б) устанаўленне савецкай улады ў Магілёве; в) стварэнне Ваенна-рэвалюцыйнага камітэта (ВРК) Заходняга фронту; г) Кастрычніцкая рэвалюцыя ў Петраградзе;

**61.** а) I Усебеларускі з’езд Саветаў; б) абвяшчэнне ССРБ; в) абвяшчэнне БНР; г) I Устаўная грамата Выканкама Рады Усебеларускага з’езда;

**62.** а) I Усебеларускі з’езд; б) стварэнне Аблвыканкамзаха; в) абвяшчэнне незалежнасці БНР; г) II Устаўная грамата Выканкама Рады Усебеларускага з’езда;

**63.** а) VI Паўночна-Заходняя абласная канферэнцыя РКП(б); б) перанос сталіцы рэспублікі ў Мінск; в) абвяшчэнне ССРБ; г) рашэнне аб аб’яднанні ССРБ і Літоўскай ССР;

**64.** а) устанаўленне Савецкай улады ў Беларусі; б) I Усебеларускі з’езд Саветаў; в) I Усебеларускі з’езд; г) абвяшчэнне ССРБ;

**65.** а) Брэсцкі мірны дагавор; б) вызваленне Мінска ад польскіх інтэрвентаў; в) Рыжскі мірны дагавор; г) другое абвяшчэнне ССРБ;

**66.** а) пачатак польска-савецкай вайны; б) аднаўленне польскай дзяржавы; в) Рыжскі мірны дагавор; г) другое абвяшчэнне ССРБ.

## Раздел 2. Беларусь ва ўмовах станаўлення савецкага сацыялістычнага грамадства. Заходняя Беларусь пад уладай Польшчы

*Выберыце правільны адказ:*

**67.** Новая эканамічная палітыка была прынята ў:

а) 1918 г.; в) 1922 г.;
б) 1921 г.; г) 1928 г.

**68.** З 1921 да 1924 г. Беларуская ССР складалася з:

а) шасці паветаў Мінскай губерні;
б) Гродзенскай і Мінскай губерняў;
в) Віцебскай, Смаленскай і Магілёўскай губерняў;
г) Гомельскага і Рэчыцкага паветаў.

**69.** Першае ўзбуйненне тэрыторыі БССР адбылося ў:

а) 1919 г.; в) 1924 г.;
б) 1921 г.; г) 1926 г.

**70.** Другое ўзбуйненне тэрыторыі БССР адбылося ў:

а) 1919 г.; в) 1924 г.;
б) 1921 г.; г) 1926 г.

**71.** У 1924 г. у склад БССР увайшлі:

а) шэсць паветаў Мінскай губерні;
б) 16 паветаў Віцебскай, Смаленскай і Гомельскай губерняў;
в) Мінская і Віленская губерні;
г) Гомельскі і Рэчыцкі паветы.

**72.** У 1926 г. да тэрыторыі БССР далучыліся:

а) шэсць паветаў Мінскай губерні;
б) 16 паветаў Віцебскай, Смаленскай і Гомельскай губерняў;
в) Мінская і Ковенская губерні;
г) Гомельскі і Рэчыцкі паветы.

**73.** IV Усебеларускі з'езд Саветаў прыняў рашэнне аб:

а) увядзенні новай эканамічнай палітыкі;
б) неабходнасці ўтварэння Саюза ССР і далучэння да яго БССР;
в) уключэнні ў склад БССР Гомельскага і Рэчыцкага паветаў;
г) прыняцці новай Канстытуцыі БССР.

**74.** IV Усебеларускі з'езд Саветаў адбыўся:

а) 15–18 снежня 1917 г.;
б) 30–31 снежня 1918 г.;
в) 2–3 лютага 1919 г.;
г) 14–18 снежня 1922 г.

**75.** I з'езд Саветаў СССР адкрыўся:

а) 15 снежня 1917 г.;
б) 30 снежня 1918 г.;
в) 2 лютага 1919 г.;
г) 30 снежня 1922 г.

**76.** Дагавор аб утварэнні СССР заключылі:

а) БССР, РСФСР, УССР і ЗСФСР;
б) БССР, РСФСР, УССР;
в) БССР і РСФСР;
г) БССР і УССР.

**77.** Адным з чатырох старшынь Прэзідыума ЦВК СССР у 1922 г. стаў:

а) К. Ландар;
б) А. Мяснікоў;
в) А. Чарвякоў;
г) З. Жылуновіч.

**78.** Другая Канстытуцыя БССР была прынята ў:

а) 1919 г.;
б) 1921 г.;
в) 1924 г.;
г) 1927 г.

**79.** Другая Канстытуцыя БССР замацоўвала:

а) факт аб'яднання БССР і іншых саюзных рэспублік у складзе СССР;
б) утварэнне БССР;
в) перамогу сацыялістычнай рэвалюцыі ў БССР;
г) пабудову сацыялістычнага грамадства ў БССР.

**80.** Інстытут беларускай культуры (Інбелкульт) быў арганізаваны ў:

а) 1919 г.; в) 1922 г.;
б) 1921 г.; г) 1929 г.

**81.** Пастанова ЦВК і СНК БССР «Аб увядзенні ўсеагульнага абавязковага навучання дзяцей ад 8 да 11 гадоў» была прынята ў:

а) 1921 г.; в) 1924 г.;
б) 1922 г.; г) 1926 г.

**82.** Інстытут беларускай культуры быў рэарганізаваны ў Акадэмію навук БССР:

а) 1919 г.; в) 1922 г.;
б) 1921 г.; г) 1929 г.

**83.** Першым рэктарам Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта з'яўляўся:

а) З. Жылуновіч; в) У. Ігнатоўскі;
б) У. Пічэта; г) М. Шчакаціхін.

**84.** Курс на правядзенне сацыялістычнай індустрыялізацыі ў СССР быў прыняты ў:

а) 1921 г.; в) 1928 г.;
б) 1925 г.; г) 1929 г.

**85.** Курс на правядзенне калектывізацыі ў СССР быў прыняты ў:

а) 1917 г.; в) 1925 г.;
б) 1921 г.; г) 1927 г.

**86.** Суцэльная калектывізацыя пачалася ў БССР у:

а) 1925 г.; в) 1929 г.;
б) 1927 г.; г) 1932 г.

**87.** Вышэйшым органам заканадаўчай улады ў БССР у адпаведнасці з Канстытуцыяй 1937 г. з'яўляўся:

а) Вярхоўны Савет БССР;
б) Усебеларускі народны сход;
в) Цэнтральны выканаўчы камітэт БССР;
г) Савет Міністраў БССР.

**88.** Вышэйшым органам выканаўчай улады ў БССР у адпаведнасці з Канстытуцыяй 1937 г з'яўляўся:

а) Вярхоўны Савет БССР;
б) Усебеларускі народны сход;
в) Савет народных камісараў БССР;
г) Цэнтральны выканаўчы камітэт БССР.

**89.** Трэцяя Канстытуцыя Беларускай ССР была прынята ў:

а) 1921 г.;
б) 1927 г.;
в) 1936 г.;
г) 1937 г.

**90.** Трэцяя Канстытуцыя Беларускай ССР замацоўвала:

а) перамогу сацыялістычнай рэвалюцыі ў БССР;
б) утварэнне БССР;
в) уваходжанне БССР у склад СССР;
г) пабудову ў БССР сацыялістычнага грамадства.

**91.** Пераход да ўсеагульнага абавязковага пачатковага навучання быў завершаны ў БССР у:

а) 1926/1927 навучальным годзе;
б) 1931/1932 навучальным годзе;
в) 1936/1937 навучальным годзе;
г) 1940/1941 навучальным годзе.

**92.** Ураджэнец Беларусі, буйны вучоны ў галіне матэматыкі, геафізікі, астраноміі і геаграфіі, адзін з арганізатараў і ўдзельнікаў асваення Паўночнага марскога шляху, Герой Савецкага Саюза, акадэмік АН СССР:

а) У. Пічэта;
б) У. Ігнатоўскі;
в) О. Шміт;
г) А. Чыжэўскі.

**93.** Ураджэнец Беларусі, біяфізік, адзін з заснавальнікаў геліябіялогіі, даследаваў уплыў касмічных фактараў і ўздзеянне паветраных іонаў на жывыя арганізмы, устанавіў залежнасць паміж цыкламі сонечнай актыўнасці і многімі з'явамі ў біясферы:

а) У. Пічэта;
б) У. Ігнатоўскі;
в) О. Шміт;
г) А.Чыжэўскі.

**94.** Заходняя Беларусь увайшла ў склад Польшчы па ўмовах:

а) Брэсцкага міру;
б) Версальскага міру;
в) Вашынгтонскага міру;
г) Рыжскага міру.

**95.** Заходнюю Беларусь у складзе Польшчы называлі:

а) «крэсы літоўскія»;
б) «крэсы заходнія»;
в) «крэсы беларускія»;
г) «крэсы ўсходнія».

**96.** Камуністычная партыя Заходняй Беларусі дзейнічала ў:

а) 1921–1939 гг.;
б) 1923–1938 гг.;
в) 1925–1927 гг.;
г) 1921–1937 гг.

**97.** Беларуская сялянска-рабочая грамада дзейнічала ў Заходняй Беларусі ў:

а) 1921–1939 гг.;
б) 1923–1938 гг.;
в) 1925–1927 гг.;
г) 1921–1937 гг.

**98.** Былыя афіцэры і чыноўнікі, якім польскі ўрад раздаваў участкі заходнебеларускіх зямель за заслугі ў польска-савецкай вайне 1919–1920 гг., называліся:

а) касінеры;
б) карабінеры;
в) асаднікі;
г) легіянеры.

**99.** Аграрная рэформа польскага ўрада, накіраваная на высяленне сялян на хутары, называлася:

а) камасацыя;
б) санацыя;
в) парцэляцыя;
г) пацыфікацыя.

**100.** Карныя экспедыцыі, якія польскія ўлады праводзілі на тэрыторыі Заходняй Беларусі, атрымалі назву:

а) камасацыя;
б) санацыя;
в) парцэляцыя;
г) пацыфікацыя.

**101.** Таварыства беларускай школы дзейнічала ў Заходняй Беларусі ў:

а) 1921–1939 гг.;
б) 1923–1938 гг.;
в) 1925–1927 гг.;
г) 1921–1937 гг.

**102.** Грамадска-палітычны дзеяч Заходняй Беларусі, аўтар «Беларускай граматыкі для школ», адзін з заснавальнікаў і кіраўнікоў Таварыства беларускай школы – гэта:

а) З. Жылуновіч;
б) Б. Тарашкевіч;
в) У. Ігнатоўскі;
г) М. Танк.

**103.** Мастак, аўтар графічнай серыі старадаўняй архітэктуры Беларусі і Літвы, пачынальнік касмічнай тэмы ў беларускім выяўленчым мастацтве:

а) П. Сергіевіч;
б) Я. Драздовіч;
в) Р. Шырма;
г) М. Гарэцкі.

*Выберыце правільныя адказы:*

**104.** Перадумовамі ўвядзення новай эканамічнай палітыкі з'яўляліся:

а) сялянскія выступленні супраць савецкай улады;
б) унутрыпартыйная барацьба па пытаннях будаўніцтва сацыялістычнага грамадства;
в) эканамічны крызіс пасля грамадзянскай вайны;
г) бальшавіцкі план пабудовы сацыялізму ў краіне.

**105.** Новая эканамічная палітыка ўводзілася з мэтай:

а) аднавіць народную гаспадарку пасля грамадзянскай вайны і інтэрвенцыі;
б) умацаваць палітычны саюз рабочых і сялян, уладу бальшавікоў;
в) наладзіць эканамічнае супрацоўніцтва з краінамі Захаду;
г) павысіць міжнародны аўтарытэт Савецкай краіны.

**106.** Новая эканамічная палітыка прадугледжвала:

а) пераход ад харчразвёрсткі да харчпадатку;
б) адмену камунальных плацяжоў;
в) ураўняльную аплату працы;
г) свабодны выбар форм землекарыстання.

**107.** Новая эканамічная палітыка прадугледжвала:

а) развіццё кааперацыі і арэнды;
б) нацыяналізацыю ўсіх прадпрыемстваў;
в) дазвол на выкарыстанне наёмнай рабочай сілы;
г) усеагульную працоўную павіннасць.

**108.** Новая эканамічная палітыка прадугледжвала:

а) пераход прадпрыемстваў на гаспадарчы разлік;
б) развіццё дзяржаўнага, кааператыўнага і прыватнага гандлю;
в) цэнтралізаванае размеркаванне прадуктаў харчавання;
г) усеагульную працоўную павіннасць.

**109.** Згодна з ленінскім планам аб'яднання савецкіх рэспублік:

а) СССР павінен быў стаць федэратыўнай дзяржавай, добраахвотным і раўнапраўным саюзам савецкіх нацыянальных рэспублік;
б) рэспублікі захоўвалі атрыбуты дзяржаўнасці – заканадаўчую, выканаўчую і судовую ўладу;

в) савецкія рэспублікі павінны былі ўвайсці ў склад РСФСР на правах аўтаномных рэспублік;
г) СССР павінен быў стаць унітарнай дзяржавай з моцным цэнтральным органам улады.

**110.** У другой Канстытуцыі БССР:

а) замацоўваліся змены ў адміністрацыйна-тэрытарыяльным падзеле рэспублікі;
б) адлюстроўваўся факт аб'яднання БССР і іншых саюзных рэспублік у адзіную саюзную дзяржаву;
в) абвяшчаўся пераход улады ў рукі Саветаў;
г) абвяшчаўся суверэнітэт БССР.

**111.** Палітыка беларусізацыі прадугледжвала:

а) перавод справаводства на беларускую мову;
б) стварэнне беларускамоўных навучальных устаноў;
в) адкрыццё Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта;
г) рэформу беларускага правапісу.

**112.** Палітыка беларусізацыі прадугледжвала:

а) вывучэнне гісторыі, геаграфіі, эканомікі і культуры Беларусі;
б) барацьбу з ідэямі нацыянал-дэмакратызму;
в) вылучэнне кадраў з карэннага насельніцтва на партыйную, савецкую, гаспадарчую і грамадскую работу;
г) стварэнне Беларускай арміі.

**113.** Да сродкаў індустрыялізацыі ў СССР і БССР адносіліся:

а) крэдыты краін Захаду;
б) прыбытак ад нацыяналізаваных фабрык, заводаў;
в) продаж збожжа, нафты, золата за мяжу;
г) прыбытак ад эксплуатацыі калоній;
д) скарачэнне сродкаў на заработную плату рабочым.

**114.** Да сродкаў індустрыялізацыі ў СССР і БССР адносіліся:

а) продаж мастацкіх каштоўнасцей, царкоўнай маёмасці за мяжу;
б) жорсткі рэжым эканоміі ў дзяржаве;
в) грашовая дапамога пралетарыяту краін Захаду;
г) дзяржаўныя займы ў насельніцтва.

**115.** Асаблівасцямі правядзення індустрыялізацыі ў БССР былі:

а) пераважнае развіццё галін прамысловасці, якія працавалі на мясцовай сыравіне;
б) буйнамаштабнае развіццё абарончай прамысловасці;
в) правядзенне індустрыялізацыі толькі за кошт рэспубліканскіх сродкаў;
г) стварэнне новых галін прамысловасці (машынабудаванне, станкабудаванне, паліўная і хімічная прамысловасці).

116. Вынікамі індустрыялізацыі ў БССР з'яўляліся:

а) пераўтварэнне БССР у індустрыяльна-аграрную рэспубліку;
б) ліквідацыя беспрацоўя;
в) адмена картачнай сістэмы на прамысловыя і харчовыя тавары;
г) аднаўленне гаспадаркі пасля грамадзянскай вайны.

**117.** Падчас калектывізацыі сельскай гападаркі ў БССР былі допушчаны памылкі:

а) парушэнне прынцыпу добраахвотнасці;
б) прымусовае перасяленне сялян на хутары;
в) фарсіраванне тэмпаў калектывізацыі;
г) забарона сялянам вучыцца ў вышэйшых навучальных установах;
д) празмернае абагуленне сялянскай маёмасці.

**118.** Характэрнымі асаблівасцямі палітычнай сістэмы беларускага грамадства ў 1930-я гг. былі:

а) адзіная палітычная партыя;
б) абмежаванне дзейнасці Саветаў рашэннем гаспадарчых і культурна-асветніцкіх задач;
в) фарміраванне прававой дзяржавы і грамадзянскага грамадства;
г) палітычныя рэпрэсіі.

**119.** Асноўнымі дасягненнямі БССР у сферы адукацыі ў 1930-я гг. былі:

а) ліквідацыя масавай непісьменнасці;
б) поўная ліквідацыя непісьменнасці сярод дарослага насельніцтва;
в) завяршэнне пераходу да ўсеагульнага абавязковага пачатковага навучання дзяцей;
г) паступовы пераход да ўсеагульнага сямігадовага навучання.

**120.** Тэрыторыя Заходняй Беларусі разглядалася польскімі ўладамі ў якасці:

а) аграрна-сыравіннага прыдатку;

б) раёна інтэнсіўнага развіцця сельскай гаспадаркі;

в) раёна развіцця цяжкай індустрыі;

г) крыніцы таннай рабочай сілы;

д) рынка збыту тавараў.

**121.** Нацыянальная палітыка польскіх улад у 1921–1939 гг. характарызавалася:

а) фальсіфікацыяй статыстычных звестак аб нацыянальным складзе насельніцтва Заходняй Беларусі;

б) закрыццём беларускіх школ;

в) пашырэннем сеткі культурна-асветніцкіх устаноў;

г) шырокім распаўсюджваннем беларускіх газет і часопісаў.

**122.** Нацыянальная палітыка польскіх улад у 1921–1939 гг. характарызавалася:

а) пашырэннем сеткі беларускіх школ;

б) забаронай карыстацца беларускай мовай у дзяржаўных установах;

в) шырокім распаўсюджваннем беларускіх газет і часопісаў;

г) забаронай для беларусаў займаць дзяржаўныя пасады.

**123.** Дзяржаўнымі мовамі на тэрыторыі БССР у 1920-я гг. акрамя беларускай і польскай прызнаваліся:

а) татарская;

б) руская;

в) латышская;

г) яўрэйская.

*Запішыце назвы гістарычных тэрмінаў:*

**124.** Элемент новай эканамічнай палітыкі, які прыйшоў на змену харчразвёрстцы, называўся …

**125.** Канцэпцыя ў аграрнай палітыцы (па прозвішчу наркама земляробства БССР), згодна з якой стаўка рабілася на развіццё хутарской сістэмы гаспадарання, называлася …

**126.** План аб’яднання савецкіх рэспублік, прапанаваны І.В. Сталіным, згодна з якім савецкія рэспублікі павінны былі ўвайсці ў склад РСФСР на правах аўтаномных рэспублік, называўся …

**127.** Палітыка нацыянальна-дзяржаўнага і нацыянальна-культурнага будаўніцтва ў БССР у 1920-я гг. называлася …

**128.** Адзін з асноўных напрамкаў палітыкі беларусізацыі, які прадугледжваў павышэнне ролі асоб карэннай нацыянальнасці ў грамадска-палітычным жыцці рэспублікі; вылучэнне кадраў з карэннага насельніцтва на партыйную, савецкую, гаспадарчую і грамадскую работу, называўся …

**129.** Працэс стварэння буйной машыннай вытворчасці ў прамысловасці і іншых галінах народнай гаспадаркі называецца …

**130.** Палітыка Савецкай дзяржавы, накіраваная на вытворчае каапераванне сялянскіх гаспадарак, масавы перавод іх з індывідуальнай сістэмы гаспадарання на калектыўную, называлася …

**131.** Кірунак грамадска-палітычнай думкі, які спалучае агульнадэмакратычныя ідэі і мэты з задачамі сацыяльнага і нацыянальнага вызвалення прыгнечаных народаў, называецца …

**132.** Былыя афіцэры польскай арміі, якім за заслугі ў польска-савецкай вайне 1919–1920 гг. польскі ўрад раздаваў участкі заходнебеларускіх зямель, называліся …

*Запішыце прозвішчы гістарычных дзеячаў:*

**133.** Рэвалюцыйны дзеяч Заходняй Беларусі, смяротнае пакаранне для якога пад ціскам насельніцтва было заменена на пажыццёвае зняволенне, – гэта …

**134.** Грамадскі дзеяч, старшыня БСРГ, вучоны-мовазнаўца, аўтар першай «Беларускай граматыкі для школ» – гэта …

**135.** Збіральнік і даследчык беларускага музычнага фальклору, выдавец фальклорнага зборніка «Беларускія народныя песні», арганізатар і кіраўнік Беларускай дзяржаўнай акадэмічнай харавой капэлы – гэта …

*Суаднясіце элементы двух мностваў:*

**136.**

| | |
|---|---|
| 1) Я. Колас | а) «Над ракою Арэсай» |
| 2) К. Крапіва | б) «Дрыгва» |
| 3) Я. Купала | в) «Хто смяецца апошнім» |
| 4) М. Лынькоў | г) «Міколка-паравоз» |

**137.**

| | |
|---|---|
| 1) М. Чуркін, М. Аладаў, Я. Цікоцкі | а) акцёры |
| 2) З. Азгур, А. Бембель, А. Глебаў | б) кампазітары |
| 3) М. Лынькоў, К. Чорны, М. Гарэцкі | в) скульптары |
| 4) Б. Платонаў, Г. Глебаў, А. Ільінскі, Л. Ржэцкая | г) пісьменнікі |

**138.**

| | |
|---|---|
| 1) 1926 г. | а) створаны Дзяржаўны тэатр оперы і балета БССР |
| 2) 1932 г. | б) адкрыта Беларуская дзяржаўная філармонія |
| 3) 1933 г. | в) адкрыта Беларуская дзяржаўная кансерваторыя |
| 4) 1937 г. | г) пераход да ўсеагульнага пачатковага навучання |

**139.**

| | |
|---|---|
| 1) Г. Лаўроў | а) Дзяржаўны тэатр оперы і балета БССР |
| 2) А. Воінаў, У. Вараксін | б) Дзяржаўная бібліятэка БССР імя У. І. Леніна |
| 3) У. Корш-Саблін | в) «Першы ўзвод» |
| 4) І. Лангбард | г) Тэатр юнага гледача БССР |

*Пастаўце ў правільнай паслядоўнасці гістарычныя падзеі:*

**140.** а) I з'езд Саветаў СССР; б) I Усебеларускі з'езд Саветаў; в) IV Усебеларускі з'езд Саветаў; г) перадача БССР Гомельскага і Рэчыцкага паветаў;

**141.** а) перадача БССР 16 паветаў Віцебскай, Гомельскай, Смаленскай губерняў; б) утварэнне СССР; в) прыняцце другой Канстытуцыі БССР; г) перадача БССР Гомельскага і Рэчыцкага паветаў;

**142.** а) адкрыццё Інстытута беларускай культуры (Інбелкульта); б) рэарганізацыя Інбелкульта ў Акадэмію навук БССР; в) завяршэнне пераходу да абавязковага пачатковага навучання; г) увядзенне ў БССР усеагульнага абавязковага навучання дзяцей ад 8 да 11 гадоў;

**143.** а) увядзенне ў БССР усеагульнага абавязковага навучання дзяцей ад 8 да 11 гадоў; б) стварэнне Акадэміі навук БССР; в) адкрыццё Дзяржаўнага тэатра оперы і балета БССР; г) адкрыццё Беларускай дзяржаўнай філармоніі.

## Раздзел 3. БССР у гады Другой сусветнай і Вялікай Айчыннай войнаў

*Выберыце правільны адказ:*

**144.** Дагавор аб ненападзенні паміж СССР і Германіяй быў падпісаны:

а) 23 жніўня 1939 г.;
б) 1 верасня 1939 г.;
в) 17 верасня 1939 г.;
г) 28 верасня 1939 г.

**145.** Другая сусветная вайна пачалася:

а) 1 верасня 1939 г.;
б) 17 верасня 1939 г.;
в) 28 верасня 1939 г.;
г) 22 чэрвеня 1941 г.

**146.** Паход Чырвонай Арміі ў Заходнюю Беларусь пачаўся:

а) 23 жніўня 1939 г.;
б) 1 верасня 1939 г.;
в) 17 верасня 1939 г.;
г) 22 чэрвеня 1941 г.

**147.** Дагавор «Аб дружбе і граніцы» паміж СССР і Германіяй быў падпісаны:

а) 23 жніўня 1939 г.;
б) 1 верасня 1939 г.;
в) 17 верасня 1939 г.;
г) 28 верасня 1939 г.

**148.** Паводле дагавора «Аб дружбе і граніцы» новая граніца паміж Германіяй і Савецкім Саюзам была праведзена па:

а) «лініі Мажына»;
б) «лініі Зігфрыда»;
в) «лініі Керзана»;
г) лініі Дзвінск – Баранавічы – Пінск.

**149.** Пасяджэнні Народнага сходу Заходняй Беларусі пачаліся:

а) 1 верасня 1939 г.;
б) 17 верасня 1939 г.;
в) 22 кастрычніка 1939 г.;
г) 28 кастрычніка 1939 г.

**150.** Вялікая Айчынная вайна пачалася:

а) 1 верасня 1939 г.;
б) 17 верасня 1939 г.;
в) 22 чэрвеня 1940 г.;
г) 22 чэрвеня 1941 г.

**151.** План нападзення Германіі на Савецкі Саюз называўся:

а) «Барбароса»;
б) «Ост»;
в) «Гельб»;
г) «Баграціён».

**152.** Адна з буйнейшых у пачатковы перыяд вайны танкавых бітваў паміж савецкімі і германскімі войскамі адбылася 6 ліпеня 1941 г. пад:

а) Брэстам; в) Лепелем;
б) Мінскам; г) Магілёвам.

**153.** Першы залп рэактыўныя ўстаноўкі «кацюша» нанеслі па германскіх войсках у раёне:

а) Оршы; в) Масквы;
б) Смаленска; г) Курска.

**154.** Батарэяй рэактыўных установак «кацюша», якая 14 ліпеня 1941 г. нанесла першы ўдар па германскіх войсках пад Оршай, камандаваў:

а) М. Гастэла; в) І. Флёраў;
б) І. Русіянаў; г) М. Раманаў.

**155.** Батарэя рэактыўных установак «кацюша» нанесла першы ўдар па германскіх войсках пад Оршай:

а) 22 чэрвеня 1941 г.; в) 6 ліпеня 1941 г.;
б) 28 чэрвеня 1941 г.; г) 14 ліпеня 1941 г.

**156.** Уся тэрыторыя Беларусі была акупіравана германскімі войскамі:

а) да пачатку жніўня 1941 г.; в) да пачатку снежня 1941 г.;
б) да пачатку верасня 1941 г.; г) да пачатку 1942 г.

**157.** План гітлераўскай Германіі, які прадугледжваў каланізацыю і германізацыю тэрыторыі Усходняй Еўропы, у тым ліку БССР, называўся:

а) «Барбароса»; в) «Гельб»;
б) «Ост»; г) «Баграціён».

**158.** Самым буйным лагерам смерці на акупіраванай тэрыторыі БССР і СССР з'яўляўся:

а) Трасцянец; в) Майданак;
б) Асвенцым; г) Трэблінка.

**159.** Цэнтральны штаб партызанскага руху ўзначальваў:

а) Г.К. Жукаў; в) І. В. Сталін;
б) П.К. Панамарэнка; г) С.К. Цімашэнка.

**160.** Беларускі штаб партызанскага руху ўзначальваў:

а) П.З. Калінін; в) К.Т. Мазураў;
б) П.М. Машэраў; г) В.І. Казлоў.

**161.** Першым беларускім раённым цэнтрам, вызваленым савецкімі войскамі ад германскіх захопнікаў, быў горад:

а) Клімавічы; в) Хоцімск;
б) Камарын; г) Касцюковічы.

**162.** Першы беларускі раённы цэнтр г. Камарын быў вызвалены ад германскіх захопнікаў:

а) 23 верасня 1943 г.; в) 23 чэрвеня 1944 г.;
б) 26 лістапада 1943 г.; г) 28 жніўня 1944 г.

**163.** Першым беларускім абласным цэнтрам, вызваленым савецкімі войскамі ад германскіх захопнікаў, быў горад:

а) Віцебск; в) Магілёў;
б) Гомель; г) Мазыр.

**164.** Аперацыя па вызваленні Беларусі ад германскіх захопнікаў атрымала ўмоўную назву:

а) «Кутузаў»; в) «Сувораў»;
б) «Румянцаў»; г) «Баграціён».

**165.** Беларуская наступальная аперацыя «Баграціён» адбывалася:

а) 23 верасня 1943 г. – 29 жніўня 1944 г.;
б) 23 чэрвеня – 3 ліпеня 1944 г.;
в) 4 ліпеня – 29 жніўня 1944 г.;
г) 23 чэрвеня – 28 жніўня 1944 г.

**166.** Дзеянні франтоў падчас Беларускай наступальнай аперацыі «Баграціён» каардынавалі маршалы Савецкага Саюза:

а) Г.К. Жукаў і А.М. Васілеўскі;
б) Л.А. Гавараў і А.І. Яроменка;
в) І.С. Конеў і Р.Я. Маліноўскі;
г) К.К. Ракасоўскі і В.Д. Сакалоўскі.

**167.** Мінск быў вызвалены ад германскіх захопнікаў:

а) 6 чэрвеня 1944 г.; в) 3 ліпеня 1944 г.;
б) 23 чэрвеня 1944 г.; г) 28 жніўня 1944 г.

**168.** Ганаровае званне «Крэпасць-герой» Брэсцкая крэпасць атрымала ў:

а) 1941 г.; в) 1965 г.;
б) 1945 г.; г) 1985 г.

**169.** Ганаровае званне «Горад-герой» Мінск атрымаў у:

а) 1944 г.; в) 1974 г.;
б) 1945 г.; г) 1985 г.

**170.** Рашэнне аб уключэнні БССР у лік краін-заснавальніц ААН было прынята на канферэнцыі ў:

а) Тэгеране; в) Ялце;
б) Патсдаме; г) Сан-Францыска.

**171.** Дэлегацыю Беларускай ССР пры падпісанні Статута ААН узначальваў:

а) П. Калінін; в) К. Кісялёў;
б) П. Цімашэнка; г) П. Машэраў.

*Суаднясіце элементы двух мностваў:*

**172.**

| | |
|---|---|
| 1) 23 жніўня 1939 г. | а) пачатак паходу Чырвонай Арміі ў Заходнюю Беларусь |
| 2) 28 верасня 1939 г. | б) Дагавор «Аб дружбе і граніцы» |
| 3) 17 верасня 1939 г. | в) Народны сход у Беластоку |
| 4) 28–30 кастрычніка 1939 г. | г) Дагавор аб ненападзенні паміж СССР і Германіяй |

**173.**

| | |
|---|---|
| 1) Дз. Паўлаў | а) камандуючы Заходнім фронтам у пачатку Вялікай Айчыннай вайны |
| 2) І. Флёраў | б) камандзір экіпажа самалёта, які здзейсніў наземны таран каля Радашковіч |
| 3) М. Гастэла | в) камандзір батарэі рэактыўных установак «кацюша» |
| 4) І. Русіянаў | г) камандзір 100-й стралковай дывізіі, якая абараняла ад германскіх захопнікаў г. Мінск |

**174.**

| | |
|---|---|
| 1) І. Флёраў | а) камандзір батарэі рэактыўных установак «кацюша» |
| 2) Дз. Паўлаў | б) кіраўнік Цэнтральнага штаба партызанскага руху |
| 3) П. Панамарэнка | в) камандуючы Заходнім фронтам у пачатку Вялікай Айчыннай вайны |
| 4) П. Калінін | г) кіраўнік Беларускага штаба партызанскага руху |

**175.**

| | |
|---|---|
| 1) 22 чэрвеня 1941 г. | а) пачатак Вялікай Айчыннай вайны |
| 2) пачатак верасня 1941 г. | б) завяршэнне аперацыі «Баграціён» |
| 3) 23 верасня 1943 г. | в) акупацыя германскімі войскамі Беларусі |
| 4) 28 жніўня 1944 г. | г) вызваленне першага беларускага раённага цэнтра ад гітлераўцаў |

**176.**

| | |
|---|---|
| 1) 23 чэрвеня 1944 г. | а) вызваленне г. Мінска ад германскіх захопнікаў |
| 2) 3 ліпеня 1944 г. | б) пачатак аперацыі «Баграціён» |
| 3) 1965 г. | в) прысваенне Брэсцкай крэпасці ганаровага звання «крэпасць-герой» |
| 4) 1974 г. | г) прысваенне г. Мінску ганаровага звання «горад-герой» |

**177.**

| | |
|---|---|
| 1) 1-ы Беларускі фронт | а) К. Ракасоўскі |
| 2) 2-і Беларускі фронт | б) Г. Захараў |
| 3) 3-і Беларускі фронт | в) І. Чарняхоўскі |
| 4) 1-ы Прыбалтыйскі фронт | г) І. Баграмян |

*Запішыце назву горада:*

**178.** Народны сход Заходняй Беларусі, які прыняў Дэкларацыю аб уваходжанні Заходняй Беларусі ў склад БССР, адбыўся ў горадзе ...

*Запішыце назвы гістарычных тэрмінаў:*

**179.** План ваенных дзеянняў Германіі супраць СССР меў кодавую назву …

**180.** План Германіі па каланізацыі і германізацыі славянскіх зямель меў кодавую назву …

**181.** Мэтанакіраваны вываз насельніцтва, абсталявання прамысловых і сельскагаспадарчых прадпрыемстваў, матэрыяльных і культурных каштоўнасцей з месц, якім пагражае акупацыя, называецца …

**182.** Добраахвотныя ваенныя і ваенізаваныя падраздзяленні (рабочыя атрады, групы самаабароны і інш.) з грамадзян, якія не падлягалі першачарговаму прызыву па мабілізацыі, называюцца …

**183.** Перавод узброенных сіл дзяржавы з мірнага стану ў баявую гатоўнасць; масавы прызыў у час вайны ва ўзброенныя сілы ваеннаабавязаных грамадзян, якія знаходзіліся ў запасе; чарговы прызыў на вайсковую службу юнакоў адпаведнага ўзросту – гэта …

**184.** Знішчэнне асобных груп насельніцтва па расавых, нацыянальных або рэлігійных матывах – гэта …

**185.** Спецыяльныя кварталы ў гарадах (гарадскія канцэнтрацыйныя лагеры), якія ствараліся гітлераўцамі на акупіраванай тэрыторыі для знішчэння яўрэйскага насельніцтва, называліся …

**186.** Палітыка супрацоўніцтва з акупантамі – гэта …

**187.** «Усходнія рабочыя»; насельніцтва з акупіраванай тэрыторыі СССР, якое вывозілі на прымусовыя работы ў Германію – гэта …

**188.** 40-кіламетровы прарыў у лініі савецка-германскага фронту паміж Веліжам і Усвятамі, праз які ажыццяўлялася сувязь партызанскіх атрадаў з «Вялікай зямлёй», называўся …

**189.** Від партызанскіх фарміраванняў, якія сталі ўзнікаць на тэрыторыі Беларусі вясной 1942 г. шляхам аб'яднання некалькіх партызанскіх атрадаў, называўся …

**190.** Скаардынаваныя аперацыі савецкіх партызан і падпольшчыкаў па масавым разбурэнні чыгуначных камунікацый (рэек, мастоў, станцый, эшэлонаў) у тыле ворага, называліся …

**191.** Польскія ваенныя фарміраванні, якія змагаліся на тэрыторыі Заходняй Беларусі за вызваленне Польшчы і аднаўленне яе ў межах да верасня 1939 г., называліся …

**192.** Нелегальная дзейнасць органаў і арганізацый, асобных прадстаўнікоў насельніцтва на захопленай ворагам тэрыторыі, накіраваная на зрыў акупацыйнай палітыкі і аднаўленне нацыянальна-дзяржаўнай незалежнасці, – гэта …

**193.** Узброеная барацьба шырокіх пластоў насельніцтва, аб'яднанага ў арганізаваныя фарміраванні на акупіраваных тэрыторыях, супраць агрэсара за дзяржаўную незалежнасць – гэта …

**194.** Наступальная аперацыя Чырвонай Арміі, у ходзе якой тэрыторыя БССР была вызвалена ад германскіх захопнікаў, называлася …

*Запішыце прозвішчы гістарычных дзеячаў:*

**195.** Генерал-маёр, камандзір 100-й дывізіі, якая ў 1941 г. абараняла ад гітлераўцаў г. Мінск, а праз два месяцы стала першай гвардзейскай дывізіяй Чырвонай Арміі, – гэта …

**196.** Батарэяй рэактыўных установак «кацюша» у ліпені 1941 г. пад Оршай камандаваў капітан ...

**197.** Кіраўніком аднаго з першых партызанскіх атрадаў, які дзейнічаў у Пінскім раёне, быў …

**198.** Кіраўнікі партызанскага атрада «Чырвоны кастрычнік», якія першымі атрымалі званне Героя Савецкага Саюза: Ц. Бумажкоў і ...

**199.** Дзеянні франтоў у час аперацыі «Баграціён» каардынавалі маршалы Савецкага Саюза А. Васілеўскі і …

**200.** Беларускі селянін, які ў час Вялікай Айчыннай вайны паўтарыў подзвіг Івана Сусаніна – завёў гітлераўскі атрад у гібельную дрыгву, – гэта …

**201.** Генерал-маёр, камандзір 172-й стралковай дывізіі, якая ў 1941 г. на працягу 23 дзён абараняла ад гітлераўцаў г. Магілёў, – гэта …

**202.** Герой Савецкага Саюза; стварыў і ўзначаліў Расонскае антыфашысцкае падполле; з 1943 г. першы сакратар Вілейскага падпольнага абкама камсамола – гэта …

**203.** Лётчык-беларус, які ў час Курскай бітвы збіў у адным паветраным баі 9 варожых самалётаў, – гэта …

**204.** Беларускі салдат, подзвіг якога знайшоў увасабленне ў помніку савецкаму воіну-вызваліцелю ў Берліне, – гэта ...

## ВЫНІКОВЫ КАНТРОЛЬ

*Суаднясіце элементы двух мностваў:*

**205.**

| | |
|---|---|
| 1) У. Пічэта | а) старшыня Інбелкульта |
| 2) У. Ігнатоўскі | б) кіраўнік партызанскага руху ў Заходняй Беларусі |
| 3) В. Корж | в) першы рэктар БДУ |
| 4) Б. Тарашкевіч | г) старшыня БСРГ |

**206.**

| | |
|---|---|
| 1) Мяснікоў А.Ф. | а) кіраўнік першага Часовага рабоча-сялянскага савецкага ўрада ССРБ |
| 2) Жылуновіч З.Х. | б) народны камісар асветы ССРБ у 1919 г., старшыня ЦВК БССР у 1924–1937 гг. |
| 3) Чарвякоў А.Р. | в) старшыня Паўночна-Заходняга абласнога камітэта РСДРП(б) |
| 4) Ігнатоўскі У.М. | г) старшыня Інбелкульта з 1926 г., першы прэзідэнт Акадэміі навук БССР |

**207.**

| | |
|---|---|
| 1) Тарашкевіч Б.А. | а) аўтар навуковай працы «Беларусы» |
| 2) Прытыцкі С.В. | б) Старшыня Саўнаркама БССР у 1927–1937 гг. |
| 3) Галадзед М.М. | в) актыўны ўдзельнік рэвалюцыйнага руху ў Заходняй Беларусі |
| 4) Карскі Я.Ф. | г) аўтар «Беларускай граматыкі для школ», кіраўнік Беларускай сялянска-рабочай грамады |

**208.**

| | |
|---|---|
| 1) Корж В.З. | а) двойчы Герой Сацыялістычнай Працы, пастаянны прадстаўнік СССР у Савеце Бяспекі ААН |
| 2) Прытыцкі С.В. | б) Герой Савецкага Саюза, камандзір 1-й Беларускай партызанскай брыгады |
| 3) Шмыроў М.П. | в) савецкі і партыйны дзеяч, актыўны ўдзельнік рэвалюцыйнага руху ў Заходняй Беларусі |
| 4) Грамыка А.А. | г) Герой Савецкага Саюза, удзельнік грамадзянскай вайны ў Іспаніі, адзін з арганізатараў і кіраўнікоў партызанскага руху ў Беларусі |

**209.**

| | |
|---|---|
| 1) Р. Астроўскі | а) кіраўнік Генеральнай акругі «Беларусь» |
| 2) В. Кубэ | б) кіраўнік Беларускай цэнтральнай рады |
| 3) К. Заслонаў | в) кіраўнік падпольнага і партызанскага руху ў час Вялікай Айчыннай вайны |
| 4) С. Прытыцкі | г) савецкі і партыйны дзеяч, актыўны ўдзельнік рэвалюцыйнага руху ў Заходняй Беларусі |

**210.**

| | |
|---|---|
| 1) 15–18 снежня 1917 г. | а) І Усебеларускі з’езд Саветаў |
| 2) 1 студзеня 1919 г. | б) І Усебеларускі з’езд |
| 3) 2–3 лютага 1919 г. | в) абвяшчэнне Дэкларацыі аб незалежнасці Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі Беларусі (ССРБ) |
| 4) 31 ліпеня 1920 г. | г) абвяшчэнне ССРБ |

**211.**

| | |
|---|---|
| 1) 25 кастрычніка 1917 г. | а) падпісанне Брэсцкага мірнага дагавора |
| 2) 21 лютага 1918 г. | б) прыняцце першай Канстытуцыі ССРБ |
| 3) 3 сакавіка 1918 г. | в) выданне першай Устаўной граматы Выканкама Рады Усебеларускага з’езда |
| 4) 2–3 лютага 1919 г. | г) абвяшчэнне аб пераходзе ўлады ў рукі Мінскага Савета рабочых і салдацкіх дэпутатаў |

**212.**

| | |
|---|---|
| 1) 9 сакавіка 1918 г. | а) абвяшчэнне ССРБ |
| 2) 25 сакавіка 1918 г. | б) абвяшчэнне Дэкларацыі аб незалежнасці Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі Беларусі (ССРБ) |
| 3) 1 студзеня 1919 г. | в) прыняцце Трэцяй Устаўной граматы Рады БНР |
| 4) 31 ліпеня 1920 г. | г) прыняцце Другой Устаўной граматы Выканкама Рады Усебеларускага з’езда |

**213.**

| | |
|---|---|
| 1) 30 снежня 1922 г. | а) пачатак Вялікай Айчыннай вайны |
| 2) 1924–1926 гг. | б) узбуйненне тэрыторыі БССР |
| 3) 1 верасня 1939 г. | в) пачатак Другой сусветнай вайны |
| 4) 22 чэрвеня 1941 г. | г) утварэнне СССР |

**214.**

| | |
|---|---|
| 1) 16 студзеня 1919 г. | а) падпісанне савецка-германскага дагавора «Аб дружбе і граніцы» |
| 2) 30 снежня 1922 г. | б) утварэнне СССР |
| 3) 28 верасня 1939 г. | в) уключэнне Віцебскай, Магілёўскай і Смаленскай губерняў у склад РСФСР |
| 4) 9 мая 1945 г. | г) канец Вялікай Айчыннай вайны |

**215.**

| | |
|---|---|
| 1) 18 сакавіка 1921 г. | а) узбуйненне тэрыторыі БССР |
| 2) 30 снежня 1922 г. | б) утварэнне СССР |
| 3) 1924–1926 гг. | в) Рыжскі мірны дагавор |
| 4) 1 верасня 1939 г. | г) пачатак Другой сусветнай вайны |

**216.**

| | |
|---|---|
| 1) 28 верасня 1939 г. | а) Народны сход у Беластоку |
| 2) 28–30 кастрычніка 1939 г. | б) падпісанне савецка-германскага дагавора «Аб дружбе і граніцы» |
| 3) 22 чэрвеня 1941 г. | в) пачатак Вялікай Айчыннай вайны |
| 4) 9 мая 1945 г. | г) канец Вялікай Айчыннай вайны |

**217.** Вызначце характэрныя рысы новай эканамічнай палітыкі і палітыкі «ваеннага камунізма»:

| | |
|---|---|
| 1) новая эканамічная палітыка | а) замена харчразвёрсткі харчовым падаткам |
| 2) палітыка «ваеннага камунізма» | б) устанаўленне дзяржаўнай манаполіі на гандаль |
| | в) дазвол свабоднага гандлю прадуктамі сваёй гаспадаркі |
| | г) дазвол дробнай прыватнай уласнасці |
| | д) харчразвёрстка |
| | е) усеагульная працоўная павіннасць |

*Запішыце назвы гістарычных тэрмінаў:*

**218.** Палітыка бальшавікоў, накіраваная на нацыянальна-культурнае будаўніцтва ў Беларусі ў 1924–1929 гг., называлася …

**219.** Працэс стварэння буйной машыннай вытворчасці ва ўсіх галінах гаспадаркі – гэта …

**220.** Працэс аб’яднання індывідуальных гаспадарак сялян у буйныя калектыўныя гаспадаркі называўся …

**221.** План каланізацыі і германізацыі славянскіх зямель меў кодавую назву …

**222.** Палітыка масавага знішчэння груп насельніцтва па тых ці іншых матывах называецца …

**223.** Акцыя партызан па масавым разбурэнні чыгунак з мэтай дэзарганізацыі нямецкіх ваенных перавозак называлася …

**224.** Аперацыя па вызваленні БССР ад германскіх захопнікаў мела кодавую назву …

**225.** План, які вызначаў мэты і дзеянні германскай арміі супраць СССР, меў кодавую назву …

**226.** Перадача маёмасці з прыватнай уласнасці ў дзяржаўную называецца …

**227.** Дзяржава, тэрыторыя якой выкарыстоўваецца ў якасці пагранічнай зоны паміж варожымі краінамі ў мэтах недапушчэння ўзнікнення ўзброенага канфлікту, называецца …

*Пастаўце ў правільнай храналагічнай паслядоўнасці гістарычныя падзеі:*

**228.** а) пачатак першай пяцігодкі; б) адкрыццё БДУ; в) адкрыццё Інбелкульта; г) прыняцце другой Канстытуцыі БССР;

**229.** а) пачатак пераходу да абавязковага пачатковага навучання ў БССР; б) курс на індустрыялізацыю; в) курс на калектывізацыю; г) пачатак другой пяцігодкі;

**230.** а) адкрыццё Дзяржаўнага тэатра оперы і балета БССР; б) адкрыццё Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі; в) увядзенне новай эканамічнай палітыкі; г) стварэнне Акадэміі навук БССР;

**231.** а) замена харчразвёрсткі харчпадаткам; б) прыняцце курса на правядзенне палітыкі калектывізацыі сельскай гаспадаркі; в) утварэнне СССР; г) прыняцце курса на правядзенне сацыялістычнай індустрыялізацыі;

**232.** а) першае ўзбуйненне БССР; б) прыняцце Заходняй Беларусі ў склад БССР; в) другое ўзбуйненне БССР; г) падпісанне Дэкларацыі і Дагавора аб стварэнні СССР;

**233.** а) прыняцце ЦВК і СНК БССР пастановы «Аб увядзенні ўсеагульнага абавязковага пачатковага навучання»; б) пераход да новай эканамічнай палітыкі; в) першае ўзбуйненне БССР; г) адкрыццё Інстытута беларускай культуры (Інбелкульта);

**234.** а) утварэнне СССР; б) першае ўзбуйненне БССР; в) заключэнне Дагавора аб ненападзенні паміж Германіяй і СССР; г) другое ўзбуйненне БССР;

**235.** а) падпісанне Брэсцкага мірнага дагавора; б) падпісанне Рыжскага мірнага дагавора; в) прыняцце Заходняй Беларусі ў склад БССР; г) прыняцце Канстытуцыі СССР, якая атрымала назву «канстытуцыя перамогшага сацыялізму»;

**236.** а) першае ўзбуйненне БССР; б) прыняцце першай Канстытуцыі БССР; в) пастанова ЦВК і СНК БССР «Аб увядзенні ўсеагульнага абавязковага навучання»; г) прыняцце Заходняй Беларусі ў склад БССР;

**237.** а) прыняцце ў СССР курса на правядзенне сацыялістычнай індустрыялізацыі; б) прыняцце першай Канстытуцыі БССР; в) прыняцце ў СССР курса на правядзенне палітыкі калектывізацыі сельскай гаспадаркі; г) рэарганізацыя Інстытута беларускай культуры ў Акадэмію навук БССР.

*Заданні па карце. Запішыце назву горада пад правільнай лічбай:*

**238.** Назва горада, дзе 3 сакавіка 1918 г. Савецкая Расія і кайзераўская Германія падпісалі мірны дагавор.

1) __________; 3) __________;
2) __________; 4) __________.



**239.** Назва горада – цэнтра беларускай губерні, якая па рашэнні бальшавіцкага кіраўніцтва 16 студзеня 1919 г. была далучана да РСФСР.

1) __________; 3) __________;
2) __________; 4) __________.



**240.** Назва горада, дзе восенню 1917 г. знаходзілася Стаўка вярхоўнага галоўнакамандуючага рускай арміяй.

1) __________; 3) __________;
2) __________; 4) __________.



**241.** Назва горада, дзе ў снежні 1917 г. пачаліся сепаратныя перагаворы паміж Савецкай Расіяй і Германіяй.

1) __________;   3) __________;

2) __________;   4) __________.



**242.** Назва горада, дзе ў 1926 г. адкрыўся Беларускі другі дзяржаўны тэатр.

1) __________;   3) __________;

2) __________;   4) __________.



**243.** Назва горада, дзе ў гады першай пяцігодкі была пабудавана швейная фабрыка «Сцяг індустрыялізацыі».

1) __________;   3) __________;

2) __________;   4) __________.



**244.** Назва горада, дзе ў гады першай пяцігодкі была пабудавана панчошна-трыкатажная фабрыка «КІМ».

1) __________;   3) __________;

2) __________;   4) __________.



**245.** Назва горада, у якім гарнізон ваеннай крэпасці трымаў абарону ад германскіх войскаў з 22 чэрвеня па 20 ліпеня 1941 г.

1) __________;   3) __________;

2) __________;   4) __________.



**246.** Назва горада, які быў захоплены гітлераўцамі 28 чэрвеня 1941 г.



1) __________;  3) __________;

2) __________;  4) __________.

**247.** Назва горада, абарону якога з 3 па 26 ліпеня 1941 г. вяла дывізія пад камандаваннем генерал-маёра М.Ц. Раманава.



1) __________;  3) __________;

2) __________;  4) __________.

**248.** Назва горада, у якім на чыгуначным вузле разгарнула дзейнасць падпольная група пад кіраўніцтвам К. Заслонава.



1) __________;  3) __________;

2) __________;  4) __________.

**249.** Назва горада, дзе адным з кіраўнікоў партыйнага падполля была В.Харужая.



1) __________;  3) __________;

2) __________;  4) __________.

**250.** Назва горада, дзе на чыгуначным вузле ў ноч на 30 ліпеня 1943 г. падпольшчыкі здзейснілі адну з самых буйных дыверсій Другой сусветнай вайны.



1) __________;  3) __________;

2) __________;  4) __________.

**251.** Назва горада, раённага цэнтра БССР, які першым быў вызвалены ад германскіх захопнікаў восенню 1943 г.



1) __________; 3) __________;

2) __________; 4) __________.

**252.** Назва горада, абласнога цэнтра БССР, які першым быў вызвалены ад германскіх захопнікаў восенню 1943 г.



1) __________; 3) __________;

2) __________; 4) __________.

## РОЗНАЎЗРОЎНЕВЫЯ ЗАДАННІ

### Раздзел 1. Кастрычніцкая рэвалюцыя. Стварэнне беларускай дзяржаўнасці

***1 узровень***

**1.** У пераліку гістарычных паняццяў вызначце тыя, якія характарызуюць развіццё Беларусі ў 1917–1920 гг.:

а) акупацыя;
б) выкупныя плацяжы;
в) «Рудабельская рэспубліка»;
г) прамысловая рэвалюцыя.

**2.** У пераліку гістарычных паняццяў вызначце тыя, якія характарызуюць развіццё Беларусі ў 1917–1920 гг.:

а) «разбор» шляхты; в) буферная дзяржава;
б) бальшавізацыя Саветаў; г) інвентарная рэформа.

**3.** У пераліку гістарычных паняццяў вызначце тыя, якія характарызуюць развіццё Беларусі ў 1917–1920 гг.:

а) грамадзянская вайна;
б) інтэрвенцыя;
в) фальваркова-паншчынная сістэма;
г) часоваабавязаныя сяляне.

**4.** У пераліку гістарычных паняццяў вызначце тыя, якія характарызуюць развіццё Беларусі ў 1917–1920 гг.:

а) ЛітБел;
б) прамысловая рэвалюцыя;
в) палітыка «ваеннага камунізму»;
г) філарэты.

**5.** У пераліку гістарычных паняццяў вызначце тыя, якія характарызуюць развіццё Беларусі ў 1917–1920 гг.:

а) план Агінскага;
б) нацыяналізацыя;
в) харчразвёрстка;
г) філаматы.

**6.** У пераліку гістарычных фактаў вызначце тыя, якія адносяцца да 1917–1920 гг.:

а) адмена прыгоннага права;
б) абвяшчэнне ССРБ;
в) Брэсцкі мірны дагавор;
г) «Курлоўскі расстрэл».

**7.** У пераліку гістарычных фактаў вызначце тыя, якія адносяцца да 1917–1920 гг.:

а) сталыпінская аграрная рэформа;
б) абвяшчэнне БНР;
в) утварэнне ЛітБел;
г) паўстанне пад кіраўніцтвам К. Каліноўскага.

**8.** У пераліку гістарычных фактаў вызначце тыя, якія адносяцца да 1917–1920 гг.:

а) І Усебеларускі з’езд;
б) рэформа П.Дз. Кісялёва;
в) Полацкі царкоўны сабор;
г) польска-савецкая вайна.

**9.** У пераліку гістарычных фактаў вызначце тыя, якія адносяцца да 1917–1920 гг.:

а) І Усебеларускі з’езд Саветаў;
б) прыняцце першай Канстытуцыі ССРБ;
в) дзейнасць таварыстваў філаматаў і філарэтаў;
г) «Свянцянскі прарыў».

*2 узровень*

**1.** Дайце азначэнні паняццяў:

а) бальшавізацыя Саветаў, нацыяналізацыя;
б) буферная дзяржава, харчразвёрстка.

**2.** Чым вядомы ў гісторыі Беларусі А. Мяснікоў, К. Ландар?

**3.** Назавіце падзеі ў гісторыі Беларусі, з якімі звязана дзейнасць З. Жылуновіча, К. Ландара.

**4.** Назавіце падзеі, якія адбываліся ў гісторыі Беларусі:

а) 25 кастрычніка – 20 лістапада 1917 г.;
б) 3 сакавіка 1918 г.

**5.** Назавіце падзеі, якія адбываліся ў гісторыі Беларусі:

а) 15–18 снежня 1917 г.;
б) 1 студзеня 1919 г.

**6.** Назавіце падзеі, якія адбываліся ў гісторыі Беларусі:

а) 9 сакавіка 1918 г.;
б) 30–31 снежня 1918 г.

**7.** Назавіце падзеі, якія адбываліся ў гісторыі Беларусі:

а) 25 сакавіка 1918 г.;
б) 2–3 лютага 1919 г.

**8.** Назавіце падзеі, якія адбываліся ў гісторыі Беларусі:

а) 31 ліпеня 1920 г.;
б) 18 сакавіка 1921 г.

**9.** Назавіце вышэйшыя органы савецкай улады, якія былі створаны ў Беларусі восенню 1917 г.

**10.** Назавіце першыя рэвалюцыйныя пераўтварэнні бальшавікоў на тэрыторыі Беларусі.

*3 узровень*

**1.** Назавіце асаблівасці ўстанаўлення савецкай улады ў Беларусі.

**2.** Назавіце мерапрыемствы палітыкі «ваеннага камунізму».

**3.** Ахарактарызуйце нямецкі і польскі акупацыйныя рэжымы на тэрыторыі Беларусі.

**4.** Назавіце рашэнні I Усебеларускага з’езду Саветаў.

**5.** Калі Віцебская, Смаленская і Магілёўская губерні былі ўключаны ў склад РСФСР? Чым было абумоўлена гэта ўключэнне?

**6.** Калі была ўтворана Літоўска-Беларуская ССР? Чым было абумоўлена яе ўтварэнне?

**7.** Калі і паміж кім былі заключаны Брэсцкі і Рыжскі мірныя дагаворы? Якімі былі іх умовы для Беларусі?

**8.** У якіх межах была адноўлена незалежнасць ССРБ 31 ліпеня 1920 г.? Чаму гэту падзею называюць другім абвяшчэннем ССРБ?

**9.** Якімі былі вынікі грамадзянскай вайны і замежнай інтэрвенцыі ў Беларусі?

### *4 узровень*

**1.** Ахарактарызуйце асноўныя сацыяльна-эканамічныя і палітычныя праблемы развіцця Расіі восенню 1917 г. і пазіцыю бальшавікоў па гэтых праблемах*. Растлумачце прычыны бальшавізацыі Саветаў восенню 1917 г.

| Сацыяльна-эканамічныя і палітычныя праблемы развіцця Расіі восенню 1917 г. | Іх змест | Пазіцыя бальшавікоў па праблемах сацыяльна-эканамічнага і палітычнага развіцця Расіі восенню 1917 г. |
|---|---|---|
| Аграрнае пытанне | | |
| Пытанне аб вайне | | |
| Нацыянальнае пытанне | | |
| Сацыяльныя ўмовы жыцця і працы рабочага класа | | |

* Заданне можа быць падзелена на 2 варыянты.

**2.** Прааналізуйце паводле плана – *прычыны*, *сутнасць*, *наступствы* – гістарычны факт:

2.1. Брэсцкі мірны дагавор.
2.2. Рыжскі мірны дагавор.
2.3. Палітыка «ваеннага камунізму».

**3.** Ахарактарызуйце прычыны, перадумовы, наступствы абвяшчэння ССРБ.

### *5 узровень*

**1.** Параўнайце пазіцыі розных палітычных дзеячаў па пытанні аб утварэнні беларускай дзяржавы. Якая пазіцыя, на ваш погляд, больш правільная? Сваю думку абгрунтуйце.

**2.** Ахарактарызуйце пазіцыі розных палітычных сіл у Беларусі восенню 1917 г. па наступных пытаннях:

| Палітычныя сілы | Шляхі далейшага развіцця краіны | Адносіны да вайны і міру | Аграрнае пытанне | Нацыянальнае пытанне |
|---|---|---|---|---|
| БСГ | | | | |
| Бальшавікі | | | | |
| Меншавікі, эсэры | | | | |
| Буржуазныя партыі | | | | |

**3.** Вынікі выбараў дэпутатаў ва Устаноўчы сход у Беларусі і на Заходнім фронце ў лістападзе 1917 г. былі наступнымі: бальшавікі – 50,7 %; эсэры – 32,2 %; буржуазныя партыі – 5 %; БСГ – 0,3 %; іншыя партыі – 11,8 %. Чым, на ваш погляд, тлумачыцца менавіта такая расстаноўка палітычных сіл у Беларусі восенню 1917 г.?

**4.** Якімі, на ваш погляд, былі прычыны і перадумовы перамогі бальшавікоў у Беларусі? Свой адказ абгрунтуйце.

**5.** Ці згодны вы з тым, што спроба кіраўніцтва БНР рэалізаваць незалежнасць беларускай дзяржавы з дапамогай знешніх сіл (кайзераўскай Германіі) была вялікай памылкай? Сваю думку абгрунтуйце.

## Раздел 2. Беларусь ва ўмовах станаўлення савецкага сацыялістычнага грамадства. Заходняя Беларусь пад уладай Польшчы

### *1 узровень*

**1.** У пераліку гістарычных паняццяў вызначце тыя, якія характарызуюць развіццё БССР у 1921–1939 гг.:

а) асаднікі;
б) бальшавізацыя Саветаў;
в) беларусізацыя;
г) індустрыялізацыя.

**2.** У пераліку гістарычных паняццяў вызначце тыя, якія характарызуюць развіццё БССР у 1921–1939 гг.:

а) інвентарная рэформа;
б) калектывізацыя;
в) камасацыя;
г) карэнізацыя.

**3.** У пераліку гістарычных паняццяў вызначце тыя, якія характарызуюць развіццё БССР у 1921–1939 гг.:

а) грамадзянская вайна; б) «крэсы ўсходнія»; в) новая эканамічная палітыка; г) «прышчэпаўшчына».

**4.** У пераліку гістарычных паняццяў вызначце тыя, якія характарызуюць развіццё БССР у 1921–1939 гг.:

а) ЛітБел; б) палітыка «санацыі»; в) нацыянал-дэмакратызм; г) харчпадатак.

**5.** У пераліку гістарычных паняццяў вызначце тыя, якія характарызуюць развіццё Заходняй Беларусі ў 1921–1939 гг.

а) асаднікі; б) беларусізацыя; в) камасацыя; г) індустрыялізацыя.

**6.** У пераліку гістарычных паняццяў вызначце тыя, якія характарызуюць развіццё Заходняй Беларусі ў 1921–1939 гг.:

а) «прышчэпаўшчына»; б) «крэсы ўсходнія»; в) палітыка «санацыі»; г) карэнізацыя.

**7.** У пераліку паняццяў вызначце тыя, якія характарызуюць новую эканамічную палітыку (НЭП):

а) харчразвёрстка; б) кааперацыя; в) натуральны абмен таварамі; г) арэнда.

**8.** У пераліку гістарычных падзей вызначце тыя, якія адносяцца да 1921–1939 гг.:

а) абвяшчэнне ССРБ;
б) абвяшчэнне БНР;
в) узбуйненне тэрыторыі БССР;
г) увядзенне новай эканамічнай палітыкі.

**9.** У пераліку гістарычных падзей вызначце тыя, якія адносяцца да 1921–1939 гг.:

а) Брэсцкі мірны дагавор;
б) палітыка беларусізацыі;
в) І Усебеларускі з’езд;
г) увядзенне ў БССР усеагульнай пачатковай адукацыі.

**10.** У пераліку гістарычных падзей вызначце тыя, якія адносяцца да 1921–1939 гг.:

а) І Усебеларускі з’езд Саветаў;
б) уваходжанне БССР у склад СССР;

в) прыняцце першай Канстытуцыі ССРБ;
г) Рыжскі мірны дагавор.

**11.** У пераліку гістарычных асоб вызначце тыя, дзейнасць якіх адносіцца да перыяду 1921–1939 гг.:

а) М. Галадзед;
б) М. Гікала;
в) В. Дунін-Марцінкевіч;
г) К. Каліноўскі.

**12.** У пераліку гістарычных асоб вызначце тыя, дзейнасць якіх адносіцца да перыяду 1921–1939 гг.:

а) Я. Драздовіч;
б) З. Жылуновіч;
в) П. Кісялёў;
г) Ф. Багушэвіч.

**13.** У пераліку гістарычных асоб вызначце тыя, дзейнасць якіх адносіцца да перыяду 1921–1939 гг.:

а) У. Галубок;
б) М. Багдановіч;
в) У. Ігнатоўскі;
г) І. Хруцкі.

**14.** У пераліку гістарычных асоб вызначце тыя, дзейнасць якіх адносіцца да перыяду 1921–1939 гг.:

а) О. Шміт;
б) Р. Шырма;
в) У. Бялыніцкі-Біруля;
г) В. Дунін-Марцінкевіч.

***2 узровень***

**1.** Дайце азначэнні паняццяў:

а) беларусізацыя, асаднікі;
б) карэнізацыя; «крэсы ўсходнія»;
в) нацыянал-дэмакратызм, палітыка «санацыі»;
г) «прышчэпаўшчына», індустрыялізацыя;
д) калектывізацыя; беларусізацыя.

**2.** Чым вядомы ў гісторыі Беларусі:

а) У. Галубок, З. Жылуновіч; О. Шміт
б) У. Ігнатоўскі, Дз. Прышчэпаў; Р. Шырма;
в) У. Пічэта, Б. Тарашкевіч, Я. Драздовіч

**3.** Назавіце падзеі, якія адбываліся ў гісторыі Беларусі ў:

а) 1921 г., 1924 г.;
б) 1922 г., 1926 г.;
в) 1927 г., 1937 г.

**4.** Назавіце тры прадпрыемствы, пабудаваныя ў БССР у гады першых пяцігодак.

**5.** Назавіце два прозвішчы беларусаў – дзеячаў культуры і навукі 1920–1930-х гг. Назавіце адзін з іх твораў (навуковыя дасягненні):

а) пісьменнікі;
б) кінематаграфісты;
в) мастакі;
г) архітэктары;
д) вучоныя.

*3 узровень*

**1.** Якімі былі сацыяльна-эканамічныя і палітычныя перадумовы пераходу да нэпа. Назавіце мэты новай эканамічнай палітыкі.

**2.** Назавіце мерапрыемствы, з якіх складалася:

а) новая эканамічная палітыка;
б) палітыка беларусізацыі.

**3.** Назавіце асаблівасці правядзення індустрыялізацыі ў БССР.

**4.** Растлумачце, як уплывала прыгранічнае становішча БССР на правядзенне індустрыялізацыі ў рэспубліцы.

**5.** Якія новыя галіны прамысловасці з'явіліся ў БССР у гады першых пяцігодак? Чым было абумоўлена іх развіццё?

**6.** Якія памылкі былі дапушчаны ў калгасным будаўніцтве ў БССР?

**7.** Растлумачце тэзіс: «БССР стала індустрыяльна-аграрнай рэспублікай Савецкага Саюза». З якімі падзеямі звязаны гэты вывад?

**8.** Калі была прынята другая канстытуцыя БССР? Якія змены ў жыцці рэспублікі яна замацавала?

**9.** Калі была прынята трэцяя Канстытуцыя БССР? Якія змены ў жыцці рэспублікі яна замацавала?

**10.** Растлумачце сувязь паміж падзеямі, якія адбыліся ў гісторыі БССР 30 снежня 1922 г., 1924 г., 1926 г.

*4 узровень*

**1.** Устанавіце прычынна-выніковыя сувязі паміж гістарычнымі фактамі:

1.1 Замена харчразвёрсткі харчпадаткам – аднаўленне сельскай гаспадаркі.

1.2. Эканамічны і палітычны крызіс у пачатку 1920-х гг. – увядзенне новай эканамічнай палітыкі.

1.3. Суцэльная калектывізацыя – індустрыялізацыя.

**2.** Прааналізуйце паводле плана – *прычыны, сутнасць, наступствы* – гістарычныя факты:

2.1. Новая эканамічная палітыка ў БССР.
2.2. Палітыка беларусізацыі.
2.3. Калектывізацыя сельскай гаспадаркі ў БССР.
2.4. Індустрыялізацыя ў БССР.
2.5. Уваходжанне БССР у склад СССР.

**3.** Ахарактарызуйце сацыяльна-эканамічнае, палітычнае і культурнае развіццё БССР у 1920–1930-я гг. Адказ афарміце ў выглядзе табліцы.

**4.** Ахарактарызуйце сацыяльна-эканамічнае, палітычнае і культурнае развіццё беларускіх зямель у складзе Польшчы ў 1921–1939 гг. Адказ афарміце ў выглядзе табліцы.

### *5 узровень*

**1.** Дайце аргументаваную ацэнку гістарычным фактам:

1.1. Новая эканамічная палітыка ў БССР.
1.2. Палітыка беларусізацыі ў БССР.
1.3. Індустрыялізацыя ў БССР.
1.4. Калектывізацыя ў БССР.
1.5. Уваходжанне БССР у склад СССР.

**2.** Параўнайце па самастойна вызначаных крытэрыях:

2.1. Палітыку «ваеннага камунізму» і новую эканамічную палітыку.
2.2. Развіццё Заходняй Беларусі і БССР у 1920–1930-я гг.

## Раздзел 3. БССР у гады Другой сусветнай і Вялікай Айчыннай войнаў

### *1 узровень*

**1.** У пераліку гістарычных паняццяў вызначце тыя, якія характарызуюць развіццё БССР у 1939–1945 гг.:

а) новая эканамічная палітыка;
б) партызанскі рух;
в) Армія Краёва;
г) беларусізацыя.

**2.** У пераліку гістарычных паняццяў вызначце тыя, якія характарызуюць развіццё БССР у 1939–1945 гг.:

а) грамадзянская вайна;
б) «Суражскія вароты»;
в) карэнізацыя;
г) падпольная барацьба.

**3.** У пераліку гістарычных паняццяў вызначце тыя, якія характарызуюць развіццё БССР у 1939–1945 гг.:

а) калабарацыянізм;
б) падпольная барацьба;
в) «прышчэпаўшчына»;
г) палітыка «санацыі».

**4.** У пераліку гістарычных паняццяў вызначце тыя, якія характарызуюць развіццё БССР у 1939–1945 гг.:

а) план «Ост»;
б) новая эканамічная палітыка;
в) рэйкавая вайна;
г) беларусізацыя.

**5.** У пераліку гістарычных падзей вызначце тыя, якія адносяцца да 1939–1945 гг.:

а) паход Чырвонай Арміі ў Заходнюю Беларусь;
б) пачатак Другой сусветнай вайны;
в) абвяшчэнне ССРБ;
г) абвяшчэнне БНР.

**6.** У пераліку гістарычных падзей вызначце тыя, якія адносяцца да 1939–1945 гг.:

а) Брэсцкі мірны дагавор;
б) народны сход у Беластоку;
в) уз’яднанне Заходняй Беларусі з БССР;
г) І Усебеларускі з’езд Саветаў.

**7.** У пераліку гістарычных падзей вызначце тыя, якія адносяцца да 1939–1945 гг.:

а) Вялікая Айчынная вайна;
б) удзел Беларусі ва ўтварэнні СССР;
в) новая эканамічная палітыка;
г) аперацыя «Баграціён».

**8.** У пераліку гістарычных падзей вызначце тыя, якія адносяцца да 1939–1945 гг.:

а) прыняцце другой Канстытуцыі БССР;
б) рэйкавая вайна;
в) Дагавор аб ненападзенні паміж Германіяй і СССР;
г) абвяшчэнне ССРБ.

**9.** У пераліку гістарычных асоб вызначце тыя, дзейнасць якіх адносіцца да перыяду 1939–1945 гг.:

а) М. Шмыроў;
б) М. Галадзед;
в) М. Гікала;
г) С. Прытыцкі.

**10.** У пераліку гістарычных асоб вызначце тыя, дзейнасць якіх адносіцца да перыяду 1939–1945 гг.:

а) З. Жылуновіч; в) В. Корж;
б) К. Заслонаў; г) Дз. Прышчэпаў.

**11.** У пераліку гістарычных асоб вызначце тыя, дзейнасць якіх адносіцца да перыяду 1939–1945 гг.:

а) П. Машэраў; в) М. Галадзед;
б) П. Панамарэнка; г) А. Чарвякоў.

### *2 узровень*

**1.** Дайце азначэнні паняццяў:

а) аперацыя «Баграціён», падпольная барацьба;
б) план «Ост», партызанскі рух;
в) «Суражскія вароты», генацыд;
г) Армія Краёва, гета;
д) калабарацыянізм, рэйкавая вайна;
е) остарбайтэры, партызанская зона.

**2.** Чым вядомы ў гісторыі Беларусі:

а) С. Прытыцкі, М. Шмыроў;
б) К. Заслонаў, П. Панамарэнка;
в) В. Корж, П. Машэраў;
г) В. Харужая, П. Калінін.

**3.** Назавіце падзеі, якія адбываліся ў гісторыі Беларусі:

а) 17 верасня 1939 г.; 3 ліпеня 1944 г.;
б) 28–30 кастрычніка 1939 г.; 22 чэрвеня 1941 г.;
в) 28 верасня 1939 г.; 23 чэрвеня – 29 жніўня 1944 г.

**4.** Назавіце асноўныя абарончыя баі ў чэрвені–жніўні 1941 г. на тэрыторыі Беларусі.

**5.** Назавіце мэты і вынікі аперацыі «Баграціён».

### *3 узровень*

**1.** Якімі знешнепалітычнымі і ўнутранымі абставінамі быў абумоўлены паход Чырвонай Арміі ў Заходнюю Беларусь 17 верасня 1939 г.? Якімі былі вынікі гэтага паходу?

**2.** Якія сацыяльна-эканамічныя і культурныя пераўтварэнні былі праведзены ў Заходняй Беларусі пасля ўз'яднання з БССР?

**3.** Якое значэнне мелі абарончыя баі ў чэрвені–жніўні 1941 г. на тэрыторыі Беларусі?

**4.** Назавіце аснаўныя рысы германскага акупацыйнага рэжыму на тэрыторыі Беларусі.

**5.** Назавіце асаблівасці антыфашысцкай барацьбы на тэрыторыі Заходняй Беларусі.

**6.** Чаму план Беларускай наступальнай аперацыі Чырвонай Арміі ў чэрвені–жніўні 1944 г. атрымаў кодавую назву «Баграціён»?

*4 узровень*

**1.** Ахарактарызуйце паводле плана – *мэты, сацыяльная база, формы барацьбы* – гістарычныя факты:

1.1. Партызанскі рух на тэрыторыі Беларусі ў 1941–1944 гг.

1.2. Падпольная барацьба беларускага народа супраць германскіх акупантаў.

**2.** Складзіце тэзісны план адказу на пытанне: «Уклад беларускага народа ў перамогу над нацысцкай Германіяй».

**3.** Канкрэтызуйце прыкладамі:

3.1. Вытокі перамогі савецкага народа над Германіяй.

3.2. Удзел жыхароў Беларусі ў еўрапейскім руху Супраціўлення.

*5 узровень*

**1.** Дайце аргументаваную ацэнку гістарычным фактам:

1.1. Уз'яднанне Заходняй Беларусі з БССР.

1.2. Уключэнне БССР у склад краін-заснавальніц ААН.

**2.** Германскія ўлады на акупіраванай тэрыторыі Беларусі дазволілі стварыць нацыяналістычныя арганізацыі – Саюз беларускай моладзі, Беларускую Цэнтральную Раду і інш. Чым, на ваш погляд, была абумоўлена такая палітыка акупантаў?

## ВЫНІКОВЫ КАНТРОЛЬ

### *1 узровень*

**1.** З пераліку гістарычных паняццяў выпішыце тыя, якія характарызуюць развіццё Беларусі ў:

1.1. 1917–1920 гг.
1.2. 1921–1939 гг.
1.3. 1941–1945 гг.

Акупацыя, аперацыя «Баграціён», беларусізацыя, выкупныя плацяжы, інвентарная рэформа, індустрыялізацыя, калектывізацыя, калабарацыянізм, карэнізацыя, новая эканамічная палітыка, палітыка «ваеннага камунізму», план «Ост», рэйкавая вайна, «разбор» шляхты, рэвалюцыя, «Рудабельская рэспубліка», «Суражскія вароты», нацыяналізацыя, фальваркова-паншчынная сістэма, часоваабавязаныя сяляне.

**2.** У пераліку гістарычных падзей вызначце тыя, якія адносяцца да:

2.1. 1917–1920 гг.
2.2. 1921–1939 гг.
2.3. 1941–1945 гг.

а) Адмена прыгоннага права; б) сталыпінская аграрная рэформа; в) абвяшчэнне ССРБ; г) Брэсцкі мірны дагавор; д) Рыжскі мірны дагавор; е) «Курлоўскі расстрэл»; ж) удзел Беларусі ва ўтварэнні СССР; з) рэформа П. Кісялёва; і) утварэнне «Суражскіх варотаў»; к) паўстанне пад кіраўніцтвам К. Каліноўскага; л) уключэнне БССР у склад ААН; м) польска-савецкая вайна; н) уз'яднанне Заходняй Беларусі з БССР; о) аперацыя «Баграціён».

**3.** У пераліку гістарычных асоб вызначце тыя, дзейнасць якіх адносіцца да:

3.1. 1917–1939 гг.
3.2. 1941–1945 гг.

М. Галадзед, М. Гікала, В. Дунін-Марцінкевіч, Я. Драздовіч, З. Жылуновіч, К. Заслонаў, У. Ігнатоўскі, К. Каліноўскі, П. Кісялёў, В. Корж, П. Машэраў, П. Панамарэнка, С. Прытыцкі, М. Сілівановіч, А. Чарвякоў, О. Шміт, А. Чыжэўскі, Р. Шырма, І. Хруцкі, В. Харужая.

*2 узровень*

**1.** Дайце азначэнні паняццяў:

1.1. Аперацыя «Баграціён», беларусізацыя;
1.2. Індустрыялізацыя, калабарацыянізм;
1.3. Калектывізацыя, план «Ост»;
1.4. Рэйкавая вайна, нацыяналізацыя.

**2.** З якімі гістарычнымі падзеямі ў гісторыі Беларусі звязана дзейнасць:

2.1. З. Жылуновіча, К. Заслонава;
2.2. У. Ігнатоўскага, П. Машэрава;
2.3. П. Панамарэнкі, С. Прытыцкага;
2.4. П. Калініна, Б. Тарашкевіча.

*3 узровень*

**1.** Назавіце асаблівасці:

1.1. Новай эканамічнай палітыкі ў БССР;
1.2. Індустрыялізацыі ў БССР;
1.3. Антыфашысцкай барацьбы ў 1941–1944 гг. у Заходняй Беларусі.

**2.** Назавіце асноўныя рысы:

2.1. Сацыяльна-эканамічнага развіцця БССР у 1917–1939 гг.;
2.2. Грамадска-палітычнага жыцця ў БССР у 1917–1939 гг.;
2.3. Культурнага развіцця БССР у 1917–1939 гг.;
2.4. Сацыяльна-эканамічнага, палітычнага, культурнага развіцця Заходняй Беларусі ў 1921–1939 гг.

**3.** У пераліку дат вызначце тыя, якія маюць адносіны да:

3.1. Працэсу стварэння беларускай дзяржаўнасці;
3.2. Барацьбы беларускага народа з акупантамі.

25 кастрычніка 1917 г. – 20 лістапада 1917 г.; 3 сакавіка 1918 г.; 9 сакавіка 1918 г.; 25 сакавіка 1918 г.; 1 студзеня 1919 г.; 2–3 лютага 1919 г.; 31 ліпеня 1920 г.; 18 сакавіка 1921 г.; 30 снежня 1922 г.; 1924 г.; 1926 г.; 28–30 кастрычніка 1939 г.; 22 чэрвеня 1941 г.; верасень 1941 г.; 23 чэрвеня – 28 жніўня 1944 г.; 3 ліпеня 1944 г.

*4 узровень*

**1.** Ахарактарызуйце паводле плана – *час правядзення, мэты, мерапрыемствы, гістарычнае значэнне* – гістарычныя факты:

1.1. Палітыка «ваеннага камунізму» у БССР;

1.2. Новая эканамічная палітыка ў БССР;
1.3. Індустрыялізацыя ў БССР;
1.4. Калектывізацыя ў БССР;
1.5. Палітыка беларусізацыі.

**2.** Дайце характарыстыку беларускага грамадства ў 1930-я гг.

| | |
|---|---|
| Эканамічная сфера | |
| Палітычная сфера | |
| Сацыяльная сфера | |
| Духоўная сфера | |

**3.** Параўнайце развіццё БССР у 1920-я і 1930-я гг. Якія змены адбыліся ў розных сферах беларускага грамадства? Чым яны былі абумоўлены?

| Пытанні для параўнання | БССР у 1920-я гг. | БССР у 1930-я гг. |
|---|---|---|
| Эканамічная сфера | | |
| Палітычная сфера | | |
| Сацыяльная сфера | | |
| Духоўная сфера | | |

### *5 узровень*

**1.** Сістэматызуйце паняцці па самастойна вызначаных крытэрыях:

акупацыя, асаднікі, Армія Краёва, аперацыя «Баграціён», беларусізацыя, генацыд, дэфензіва, індустрыялізацыя, калектывізацыя, камасацыя, калабарацыянізм, карэнізацыя, нацыяналізацыя, новая эканамічная палітыка, палітыка «ваеннага камунізму», палітыка «санацыі», план «Ост», рэйкавая вайна, рэвалюцыя, «Рудабельская рэспубліка», «Суражскія вароты».

**2.** Сістэматызуйце прозвішчы гістарычных дзеячаў па самастойна вызначаных крытэрыях:

М. Галадзед, М. Гікала, Я. Драздовіч, З. Жылуновіч, К. Заслонаў, У. Ігнатоўскі, В. Корж, П. Калінін, К. Ландар, П. Машэраў, П. Панамарэнка, С. Прытыцкі, Б. Тарашкевіч, А. Чарвякоў, О. Шміт, А. Чыжэўскі, Р. Шырма, В. Харужая.

**3.** Ахарактарызуйце змены тэрыторыі БССР у 1919–1939 гг. Вызначце гістарычныя ўмовы гэтых змен.

**Тэрытарыяльныя змены БССР у першай палове XX ст.**

| Перыяд | Гістарычныя ўмовы | Тэрыторыя БССР |
|---|---|---|
| 1919 г.<br>1 студзеня<br>16 студзеня<br>2–3 лютага | | |
| 31 ліпеня 1920 г. | | |
| 18 сакавіка 1921 г. | | |
| 1924 г. | | |
| 1926 г. | | |
| 1939 г. | | |

## XI КЛАС
## Гісторыя Беларусі: другая палова 1940-х гг. – пачатак XXI ст.

## ТЭСТАВЫЯ ЗАДАННІ

### Раздзел 1. БССР у другой палове 1940-х – першай палове 1950-х гг.

*Выберыце правільны адказ:*

**1.** Дапамогу ў аднаўленні народнай гаспадаркі пасля Вялікай Айчыннай вайны БССР атрымала ад:

а) савецкіх рэспублік;
б) ЗША;
в) краін Заходняй Еўропы;
г) Лігі Нацый.

**2.** Адной з важнейшых асаблівасцей пасляваеннага адраджэння БССР з'яўлялася прыярытэтнае развіццё:

а) сельскай гаспадаркі;
б) дрэваапрацоўчай прамысловасці;
в) цяжкай прамысловасці;
г) харчовай прамысловасці.

**3.** Аднаўленне народнай гаспадаркі БССР пачалося:

а) восенню 1943 г.;
б) летам 1944 г.;
в) летам 1945 г.;
г) у 1946 г.

**4.** Мінскі трактарны завод выпусціў сваю першую прадукцыю ў:

а) 1945 г.;
б) 1946 г.;
в) 1947 г.;
г) 1950 г.

**5.** Характэрнай асаблівасцю чацвёртай пяцігодкі ў БССР з'яўлялася:

а) паскоранае развіццё сельскай гаспадаркі;
б) укараненне дасягненняў навукі і тэхнікі ў традыцыйныя для Беларусі галіны прамысловасці;
в) апераджальныя ў параўнанні з адпаведнымі паказчыкамі па СССР тэмпы індустрыяльнага развіцця;
г) з'яўленне нафтахімічнай прамысловасці.

**6.** Прамысловасць Беларусі перавысіла даваенны ўзровень у:

а) 1946 г.; в) 1950 г.;
б) 1948 г.; г) 1953 г.

**7.** Картачная сістэма на харчовыя і прамысловыя тавары была адменена ў:

а) 1946 г.; в) 1948 г.;
б) 1947 г.; г) 1950 г.

**8.** Ядром палітычнай сістэмы беларускага грамадства ў першае пасляваеннае дзесяцігоддзе з'яўляўся(лася):

а) Камуністычная партыя Беларусі;
б) Вярхоўны Савет БССР;
в) Савет Народных камісараў БССР;
г) Савет Міністраў БССР.

**9.** Вышэйшым органам заканадаўчай улады ў БССР да 1946 г. з'яўляўся:

а) Вярхоўны Савет БССР;
б) ЦК КП(б)Б;
в) Савет Народных камісараў БССР;
г) Савет Міністраў БССР.

**10.** Выканаўчым органам савецкай улады ў БССР да 1946 г. з'яўляўся:

а) Вярхоўны Савет БССР;
б) ЦК КП(б)Б;
в) Савет Народных камісараў БССР;
г) Савет Міністраў БССР.

**11.** Выканаўчым органам савецкай улады ў БССР пасля 1946 г. з'яўляўся:

а) Вярхоўны Савет БССР;
б) ЦК КП(б)Б;
в) Савет Народных камісараў БССР;
г) Савет Міністраў БССР.

**12.** У 1949/50 навучальным годзе ў БССР пачаўся пераход да:

а) усеагульнага пачатковага навучання;
б) усеагульнага сямігадовага навучання;
в) усеагульнага сярэдняга навучання;
г) усеагульнай вышэйшай адукацыі.

**13.** Вядучай навуковай установай у БССР у пасляваенны перыяд з'яўляўся(лася):

а) Інстытут беларускай культуры (Інбелкульт);
б) Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт;
в) Акадэмія навук БССР;
г) Інстытут народнай гаспадаркі.

**14.** Аўтарам тэксту «Мы - беларусы», які стаў Дзяржаўным гімнам БССР, з'яўляўся:

а) Н. Сакалоўскі;
б) М. Клімковіч;
в) А. Куляшоў;
г) М. Танк.

**15.** Кампазітар, які напісаў музыку да тэксту «Мы – беларусы», – гэта:

а) Н. Сакалоўскі;
б) М. Клімковіч;
в) А. Куляшоў;
г) М. Танк.

*Выберыце правільныя адказы:*

**16.** Для пасляваеннага аднаўлення народнай гаспадаркі БССР былі характэрны:

а) пераважнае развіццё цяжкай прамысловасці;
б) дапамога краін Заходняй Еўропы;
в) захаванне калгаснай сістэмы ў сельскай гаспадарцы;
г) адмова ад калектывізацыі ў Заходняй Беларусі.

**17.** Для пасляваеннага аднаўлення народнай гаспадаркі БССР былі характэрны:

а) пераважнае развіццё лёгкай прамысловасці;
б) дапамога савецкіх рэспублік;
в) пераход да хутарскай сістэмы ў сельскай гаспадарцы;
г) правядзенне калектывізацыі ў Заходняй Беларусі.

**18.** Да фактараў, якія абумовілі крызісны стан сельскай гаспадаркі БССР у першае пасляваеннае дзесяцігоддзе, адносіліся:

а) фінансаванне сельскай гаспадаркі па рэштакавым прынцыпе;
б) высокія закупачныя цэны на сельскагаспадарчую прадукцыю;
в) высокія пастаўкі сельскагаспадарчай прадукцыі дзяржаве;
г) адсутнасць МТС.

**19.** Да мер па пераадоленні крызіснага стану сельскай гаспадаркі ў БССР у 1950-я гг. адносіліся:

а) павышэнне закупачных цэн на сельскагаспадарчую прадукцыю;
б) спісанне запазычанасці з калгасаў і калгаснікаў па сельскагаспадарчаму падатку за папярэднія гады;
в) павышэнне для калгасаў абавязковых паставак дзяржаве сельскагаспадарчай прадукцыі;
г) перавод калгасаў на самафінансаванне.

**20.** Грамадска-палітычнае жыццё ў БССР у першае пасляваеннае дзесяцігоддзе характарызавалася:

а) існаваннем адзінай палітычнай партыі;
б) роспускам Саветаў дэпутатаў працоўных;
в) падпарадкаваннем грамадскіх арганізацый (прафсаюзаў, камсамола і інш.) Камуністычнай партыі;
г) шматпартыйнасцю.

**21.** Грамадска-палітычнае жыццё ў БССР у першае пасляваеннае дзесяцігоддзе характарызавалася:

а) павышэннем ролі Вярхоўнага і мясцовых Саветаў;
б) роспускам Саветаў дэпутатаў працоўных;
в) кіруючай роляй Камуністычнай партыі;
г) забаронай дзейнасці прафсаюзнай арганізацыі.

**22.** Галоўнымі перашкодамі ў развіцці беларускай навукі ў першае пасляваеннае дзесяцігоддзе былі:

а) слабая матэрыяльна-тэхнічная база навуковых устаноў;
б) адміністрацыйныя метады кіравання навукай;
в) адсутнасць Акадэміі навук;
г) закрыццё настаўніцкіх інстытутаў.

*Запішыце назвы гістарычных тэрмінаў:*

**23.** Поўная ці частковая кампенсацыя, выплата матэрыяльных страт ад вайны дзяржавай, якая здзейсніла агрэсію, той краіне, якая пацярпела ад яе, называецца …

**24.** Вяртанне на радзіму ваеннапалонных, бежанцаў, перасяленцаў, якія апынуліся за межамі радзімы ў выніку вайны, з аднаўленнем іх у правах, называецца …

**25.** Мастацкі метад, які патрабаваў ад дзеячаў культуры адлюстравання ў сваіх творах сюжэтаў, звязаных з будаўніцтвам сацыялістычнага грамадства, – гэта …

*Суаднясіце элементы двух мностваў:*

**26.**

| | |
|---|---|
| 1) П. Панамарэнка | а) старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР у 1948–1967 гг. |
| 2) В. Казлоў | б) першы сакратар ЦК КП(б)Б у 1938–1947 гг. |
| 3) М. Гусеў | в) мастак, які распрацаваў малюнак Дзяржаўнага сцяга БССР |
| 4) А. Грамыка | г) ураджэнец Гомельшчыны, міністр замежных спраў СССР у 1957–1985 гг. |

**27.**

| | |
|---|---|
| 1) Р. Шырма | а) кіраўнік Дзяржаўнага народнага аркестру БССР |
| 2) І. Жыновіч | б) кіраўнік Дзяржаўнай акадэмічнай харавой капэлы БССР |
| 3) В. Купрэвіч | в) прэзідэнт Акадэміі навук БССР у 1952–1969 гг. |
| 4) Г. Цітовіч | г) кіраўнік Дзяржаўнага акадэмічнага народнага хору БССР |

**28.**

| | |
|---|---|
| 1) М. Лынькоў | а) «Млечны шлях» |
| 2) К.Чорны | б) «Векапомныя дні» |
| 3) І. Мележ | в) «Мінскі напрамак» |
| 4) І. Шамякін | г) «Глыбокая плынь» |

**29.**

| | |
|---|---|
| 1) паэма, прысвечаная барацьбе супраць германскіх акупантаў | а) «Гартаванне» |
| 2) аповесць пра будаўніцтва Мінскага трактарнага завода | б) «Сцяг брыгады» |
| 3) раман, прысвечаны падзеям аперацыі «Баграціён» | в) «Мінскі напрамак» |
| 4) першы беларускі «партызанскі» раман | г) «Глыбокая плынь» |

**30.**

| | |
|---|---|
| 1) П. Броўка, М. Танк, А. Куляшоў | а) артысты тэатру |
| 2) Г. Глебаў, Б. Платонаў, С. Станюта | б) паэты |
| 3) Я. Цікоцкі, А. Багатыроў, Дз. Лукас | в) кампазітары |
| 4) Я. Зайцаў, У. Сухаверхаў, В. Волкаў | г) мастакі |

**31.**

| | |
|---|---|
| 1) Я. Зайцаў | а) «За родную Беларусь» |
| 2) У. Сухаверхаў | б) «Абарона Брэсцкай крэпасці ў 1941 г.» |
| 3) В. Волкаў | в) «Мінск. 3 ліпеня 1944 г.» |
| 4) У. Хрусталёў | г) «К. Заслонаў» |

## Раздзел 2. БССР у другой палове 1950-х – 1980-я гг.

*Выберыце правільны адказ:*

**32.** К.Т. Мазураў у 1956–1965 гг. займаў пасаду:

а) Генеральнага сакратара ЦК КПСС;
б) Першага сакратара ЦК КПБ;
в) Старшыні Савета Міністраў БССР;
г) Старшыні Вярхоўнага Савета БССР.

**33.** У 1956–1965 гг. партыйную арганізацыю Беларусі ўзначальваў:

а) К.Т. Мазураў;
б) В.І. Казлоў;
в) П.К. Панамарэнка;
г) П.М. Машэраў.

**34.** Усе пытанні палітычнага, сацыяльна-эканамічнага і культурнага жыцця БССР у другой палове 1950-х – першай палове 1980-х гг. знаходзіліся пад кантролем:

а) прафсаюзаў;
б) мясцовых Саветаў;
в) камсамольскіх арганізацый;
г) партыйных камітэтаў.

**35.** Вышэйшым заканадаўчым органам дзяржаўнай улады ў БССР у другой палове 1950-х – першай палове 1980-х гг. з’яўляўся:

а) ЦК КПБ;
б) Вярхоўны Савет БССР;
в) Савет Міністраў БССР;
г) Усебеларускі народны сход.

**36.** Выканаўчым органам дзяржаўнай улады ў БССР у другой палове 1950-х – першай палове 1980-х гг. з'яўляўся:

а) ЦК КПБ;
б) Вярхоўны Савет БССР;
в) Савет Міністраў БССР;
г) Усебеларускі народны сход.

**37.** П.М. Машэраў займаў пасаду Першага сакратара ЦК КПБ у перыяд:

а) 1945–1956 гг.;
б) 1956–1965 гг.;
в) 1965–1980 гг.;
г) 1980–1983 гг.

**38.** П.М. Машэраў у 1965–1980-я гг. займаў пасаду:

а) Генеральнага сакратара ЦК КПСС;
б) Першага сакратара ЦК КПБ;
в) Старшыні Савета Міністраў БССР;
г) Старшыні Вярхоўнага Савета БССР.

**39.** П.М. Машэраў займаў пасаду Першага сакратара ЦК КПБ у той час, калі на чале СССР стаяў:

а) І.В. Сталін;
б) М.С. Хрушчоў;
в) Л.І. Брэжнеў;
г) М.С. Гарбачоў.

**40.** Кіруючая і накіроўваючая роля КПБ была замацавана ў Канстытуцыі БССР, прынятай у:

а) 1919 г.;
б) 1927 г.;
в) 1937 г.;
г) 1978 г.

**41.** Гаспадарчая рэформа 1965 г. прадугледжвала:

а) увядзенне элементаў рыначных адносін;
б) адмову ад каманднa-адміністрацыйных метадаў кіравання;
в) стварэнне саўнаргасаў;
г) адмову ад пяцігадовых планаў.

**42.** Асушэнне забалочаных зямель з мэтай павелічэння пасяўных плошчаў называецца:

а) хімізацыяй;
б) селекцыяй;
в) меліярацыяй;
г) механізацыяй.

**43.** Адзін з кірункаў інтэнсіфікацыі сельскай гаспадаркі БССР, які заключаўся ў шырокім выкарыстанні мінеральных угнаенняў, вапнаванні кіслых глебаў, – гэта:

а) хімізацыя;
б) селекцыя;
в) меліярацыя;
г) механізацыя.

**44.** Напрамак развіцця сельскай гаспадаркі, праяўленнем якога было стварэнне ў БССР у канцы 1960-х гг. буйных жывёлагадоўчых комплексаў:

а) хімізацыя; в) канцэнтрацыя;
б) селекцыя; г) механізацыя.

**45.** «Харчовая праграма СССР», прынятая ў 1982 г., прадугледжвала:

а) стварэнне аграрна-прамысловых комплексаў (АПК);
б) хімізацыю сельскай гаспадаркі;
в) меліярацыю Палесся;
г) механізацыю сельскай гаспадаркі.

**46.** Курс на паскарэнне сацыяльна-эканамічнага развіцця ў СССР быў прыняты ў:

а) 1978 г.; в) 1985 г.;
б) 1982 г.; г) 1987 г.

**47.** Аварыя на Чарнобыльскай атамнай электрастанцыі адбылася ў:

а) красавіку 1985 г.; в) верасні 1990 г.;
б) красавіку 1986 г.; г) сакавіку 1991 г.

**48.** Рэферэндум па пытанні захавання Саюза ССР быў праведзены:

а) 14 красавіка 1985 г.; в) 17 верасня 1990 г.;
б) 26 красавіка 1986 г.; г) 17 сакавіка 1991 г.

**49.** У пачатку 1960-х гг. у БССР была ўведзена абавязковая:

а) пачатковая адукацыя;
б) сямігадовая адукацыя;
в) васьмігадовая адукацыя;
г) адзінаццацігадовая адукацыя.

**50.** У канцы 1970-х гг. у БССР быў завершаны пераход да ўсеагульнай:

а) пачатковай адукацыі; в) сярэдняй адукацыі;
б) базавай адукацыі; г) вышэйшай адукацыі.

*Выберыце правільныя адказы:*

**51.** Лібералізацыя палітычнага курса ў БССР, як і ў СССР, пасля смерці І.В. Сталіна характарызавалася:

а) павышэннем ролі Саветаў дэпутатаў;
б) працэсам фарміравання шматпартыйнасці;
в) працэсам рэабілітацыі ахвяр рэпрэсій;
г) правядзеннем выбараў на альтэрнатыўнай аснове.

**52.** Для грамадска-палітычнага развіцця БССР у другой палове 1950-х – першай палове 1960-х гг. былі характэрны:

а) захаванне аднапартыйнай сістэмы;
б) фарміраванне шматпартыйнасці;
в) павышэнне ролі грамадскіх арганізацый;
г) замацаванне кіруючай ролі КПБ у Канстытуцыі БССР.

**53.** Для грамадска-палітычнага развіцця БССР у другой палове 1950-х гг. – першай палове 1960-х гг. былі характэрны:

а) фарміраванне шматпартыйнасці;
б) рэабілітацыя рэпрэсіраваных;
в) крытыка культу асобы І. Сталіна;
г) замацаванне кіруючай ролі КПБ у Канстытуцыі БССР.

**54.** Эканамічная рэформа 1965 г. прадугледжвала:

а) скасаванне саўнаргасаў;
б) памяншэнне абавязковых планавых паказчыкаў, якія спускаліся прадпрыемству зверху;
в) увядзенне ў якасці асноўнага паказчыка работы прадпрыемства аб'ёма валавой прадукцыі;
г) ліквідацыю самастойнасці прадпрыемстваў.

**55.** Эканамічная рэформа 1965 г. прадугледжвала:

а) скасаванне міністэрстваў;
б) павелічэнне абавязковых планавых паказчыкаў, якія спускаліся прадпрыемству зверху;
в) увядзенне ў якасці асноўнага паказчыка работы прадпрыемства аб'ёма рэалізаванай прадукцыі;
г) увядзенне гаспадарчага разліку.

**56.** Гаспадарчая рэформа 1965 г. прадугледжвала:

а) скарачэнне планавых паказчыкаў, якія вызначала прадпрыемству дзяржава;
б) увядзенне гаспадарчага разліку;
в) ліквідацыю каманднa-адміністрацыйнай сістэмы кіравання;
г) пераход да рыначнай эканамічнай сістэмы.

**57.** З мэтай павысіць сельскагаспадарчую вытворчасць у другой палове 1960-х – першай палове 1980-х гг. у СССР і БССР былі прыняты наступныя меры:

а) зніжаны закупачныя цэны на сельскагаспадарчую прадукцыю;

б) спісана запазычанасць калгасаў за тэхніку, якую яны набылі ў дзяржавы;
в) павялічаны падаткі, якія калгасы плацілі ў дзяржаўны бюджэт;
г) уведзены стабільны план закупак сельскагаспадарчай прадукцыі.

**58.** З мэтай павысіць сельскагаспадарчую вытворчасць у другой палове 1960-х – першай палове 1980-х гг. у СССР і БССР былі прыняты наступныя меры:

а) дадзена магчымасць калгасам самастойна распараджацца звышпланавай прадукцыяй;
б) зніжаны дзяржаўныя капіталаўкладанні на патрэбы сяла;
в) уведзена гарантаваная аплата працы калгаснікаў у адпаведнасці з тарыфнымі стаўкамі;
г) забаронена выдача калгаснікам пашпартоў.

**59.** Паспяховаму развіццю сельскай гаспадаркі ў БССР у другой палове 1960-х – першай палове 1980-х гг. перашкаджалі:

а) забруджванне часткі тэрыторыі рэспублікі ў выніку аварыі на Чарнобыльскай АЭС;
б) нерацыянальнае расходаванне сродкаў і ўзрастанне сабекошту прадукцыі;
в) каманднa-адміністрацыйныя метады кіравання;
г) адсутнасць тэхнікі ў калгасах.

**60.** Для эканамічнага развіцця БССР у 1960-я – 1970-я гг. былі характэрны:

а) экстэнсіўны шлях развіцця прамысловасці і сельскай гаспадаркі;
б) інтэнсіўны шлях развіцця эканомікі;
в) адмова ад каманднa-адміністрацыйных метадаў кіравання;
г) зніжэнне тэмпаў прыросту прадукцыйнасці працы.

**61.** Эканамічнае развіццё БССР у першай палове 1980-х гг. характарызавалася:

а) зніжэннем тэмпаў эканамічнага росту;
б) прыярытэтным развіццём цяжкай і абароннай прамысловасці;
в) пераводам эканомікі на рыначныя адносіны;
г) інтэнсіўным шляхам развіцця.

**62.** Развіццё эканомікі БССР у першай палове 1980-х гг. характарызавалася:

а) запавольваннем тэмпаў эканамічнага росту;
б) павышэннем якасці многіх відаў прадукцыі;
в) дэфіцытам высокаякасных тавараў;
г) шырокім укараненнем новых тэхналогій ва ўсе галіны вытворчасці.

**63.** Грамадска-палітычнае жыццё ў БССР у другой палове 1960-х – першай палове 1980-х гг. характарызавалася:

а) ростам колькасці членаў грамадскіх аб’яднанняў;
б) выбарамі ў Саветы дэпутатаў працоўных на альтэрнатыўнай аснове;
в) фарміраваннем шматпартыйнасці;
г) замацаваннем кіруючай ролі КПБ у Канстытуцыі БССР.

**64.** Для грамадска-палітычнага развіцця БССР у другой палове 1960-х – першай палове 1980-х гг.былі характэрны:

а) узмацненне фармалізму ў дзейнасці грамадскіх арганізацый;
б) поўнаўладдзе Саветаў;
в) палітычны плюралізм;
г) замацаванне кіруючай ролі КПБ у Канстытуцыі БССР.

**65.** Прыкметамі палітыкі «перабудовы» ў палітычнай сістэме БССР у другой палове 1980-х гг. з’яўляліся:

а) фарміраванне шматпартыйнасці;
б) спыненне дзейнасці КПБ;
в) галоснасць;
г) прыняцце новай Канстытуцыі БССР.

**66.** Прыкметамі палітыкі «перабудовы» ў палітычнай сістэме БССР у другой палове 1980-х гг. з’яўляліся:

а) палітыка галоснасці;
б) фарміраванне палітычнай апазіцыі;
в) адмова ад шматпартыйнасці;
г) абвяшчэнне дзяржаўнага суверэнітэту рэспублікі.

**67.** Прыкметамі палітыкі «перабудовы» ў палітычнай сістэме БССР у другой палове 1980-х гг. з’яўляліся:

а) фарміраванне шматпартыйнасці;
б) галоснасць;

в) абвяшчэнне дзяржаўнага суверэнітэту рэспублікі;
г) фарміраванне двухпалатнага Нацыянальнага схода.

**68.** Прыкметамі палітыкі «перабудовы» ў эканамічнай сістэме БССР у другой палове 1980-х гг. з'яўляліся:

а) пашырэнне самастойнасці прадпрыемстваў;
б) перавод прадпрыемстваў на самафінансаванне;
в) увядзенне саўнаргасаў;
г) замена калгаснай сістэмы гаспадарання фермерскай.

**69.** Прыкметамі палітыкі «перабудовы» ў эканамічнай сістэме БССР у другой палове 1980-х гг. з'яўляліся:

а) перавод прадпрыемстваў на самафінансаванне;
б) узмацненне кантролю за прадпрыемствамі з боку дзяржавы;
в) перавод прадпрыемстваў на гаспадарчы разлік;
г) увядзенне саўнаргасаў.

*Суаднясіце элементы двух мностваў:*

**70.**

| | |
|---|---|
| 1) К. Мазураў | а) Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР у 1968–1971 гг. |
| 2) С. Прытыцкі | б) Першы сакратар ЦК КПБ у 1965–1980 гг. |
| 3) П. Машэраў | в) Герой Савецкага Саюза і Сацыялістычнай працы, старшыня калгаса «Рассвет» Кіраўскага раёна Магілёўскай вобласці |
| 4) К. Арлоўскі | г) Першы сакратар ЦК КПБ у 1956–1965 гг. |

**71.**

| | |
|---|---|
| 1) «Лявоніха на арбіце» | а) А. Адамовіч, Я. Брыль, У. Калеснік |
| 2) «Я з вогненнай вёскі...» | б) В. Быкаў |
| 3) «Брама неўміручасці» | в) А. Макаёнак |
| 4) «Трэцяя ракета» | г) К. Крапіва |

**72.**

| | |
|---|---|
| 1) «Альпійская балада» | а) Я. Колас |
| 2) «На ростанях» | б) В. Быкаў |
| 3) «Птушкі і гнёзды» | в) У. Караткевіч |
| 4) «Каласы пад сярпом тваім» | г) Я. Брыль |

**73.**

| | |
|---|---|
| 1) «Палеская хроніка» | а) М. Савіцкі |
| 2) «Брэсцкая крэпасць» | б) І. Мележ |
| 3) цыкл карцін «Лічбы на сэрцы» | в) Ю. Семяняка |
| 4) «Зорка Венера» | г) К. Губарэвіч |

**74.**

| | |
|---|---|
| 1) мастак | а) В. Быкаў |
| 2) пісьменнік | б) Ю. Семяняка |
| 3) кампазітар | в) З. Азгур |
| 4) скульптар | г) А. Ісачоў |

**75.**

| | |
|---|---|
| 1) драматург | а) І. Ахрэмчык |
| 2) мастак | б) А. Бембель |
| 3) скульптар | в) А. Макаёнак |
| 4) артыст | г) С. Станюта |

**76.**

| | |
|---|---|
| 1) дзеячы навукі | а) Н. Сакалоўскі, М. Клімковіч |
| 2) касманаўты | б) У. Алоўнікаў, С. Картэс |
| 3) аўтары Дзяржаўнага гімну БССР «Мы – беларусы» | в) А. Жэбрак, В. Купрэвіч |
| 4) кампазітары | г) П. Клімук, У. Кавалёнак |

**77.**

| | |
|---|---|
| 1) «Партызанская мадонна» | а) М. Савіцкі |
| 2) «Спадчына» | б) М. Данцыг |
| 3) манумент у гонар савецкай маці-патрыёткі ў Жодзіне | в) А. Заспіцкі, І. Міско, М. Рыжанкоў |
| 4) мемарыяльны комплекс «Хатынь» | г) С. Селіханаў |

*Запішыце прозвішча мастака:*

**78.** Беларускі мастак, былы вязень фашысцкага канцлагера, аўтар серыі карцін «Лічбы на сэрцы» – гэта …

*Запішыце назвы гістарычных тэрмінаў:*

**79.** Працэс пераадолення культу асобы Сталіна, звязаны з дэмакратызацыяй грамадска-палітычнага жыцця, рэабілітацыяй нявінна пацярпелых ад палітычных рэпрэсій – гэта …

**80.** Аднаўленне добрага імя і правоў нявінна асуджаных – гэта …

**81.** Карэнныя змены вытворчасці, якія адбываюцца ў выніку ператварэння навукі ў непасрэдную вытворчую сілу, укаранення навуковых дасягненняў у вытворчасць, называюцца …

**82.** Палітычны кірунак, пры якім воля кіруючай асобы ці выканаўчай улады лічыцца вызначальнай асновай грамадскага развіцця, называецца …

**83.** Прыстасаванне зямлі да сельскагаспадарчага выкарыстання праз асушэнне балот – гэта …

**84.** Колькасны рост гарадоў і павелічэнне гарадскога насельніцтва называецца …

**85.** Метад гаспадарання, пры якім даходы, што атрымлівае прадпрыемства ад рэалізацыі сваёй прадукцыі, перавышаюць яго выдаткі на вытворчасць, называецца …

**86.** Метад гаспадарання, пры якім прадпрыемства не атрымлівае фінансавых сродкаў з дзяржаўнага бюджэту, а зарабляе грошы самастойна, за кошт сваёй вытворчасці і рэалізацыі прадукцыі, называецца …

**87.** Шлях развіцця эканомікі, калі павелічэнне колькасці выпускаемай прадукцыі дасягаецца за кошт укаранення дасягненняў НТР, павелічэння прадукцыйнасці працы, называецца …

**88.** Шлях развіцця эканомікі, пры якім павелічэнне колькасці выпускаемай прадукцыі дасягаецца за кошт росту колькасці працуючых, станкоў, прадпрыемстваў, называецца …

## Раздзел 3. Станаўленне і ўмацаванне дзяржаўнага суверэнітэту Рэспублікі Беларусь

*Выберыце правільны адказ:*

**89.** Дэкларацыя аб дзяржаўным суверэнітэце БССР была прынята:

а) 27 ліпеня 1990 г.;
б) 19 верасня 1991 г.;
в) 15 сакавіка 1994 г.;
г) 14 мая 1995 г.

**90.** Назва «Рэспубліка Беларусь» была прынята Вярхоўным Саветам БССР:

а) 12 чэрвеня 1990 г.;
б) 27 ліпеня 1990 г.;
в) 26 жніўня 1991 г.;
г) 19 верасня 1991 г.

**91.** Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь была прынята:

а) 27 ліпеня 1990 г.;
б) 19 верасня 1991 г.;
в) 15 сакавіка 1994 г.;
г) 10 ліпеня 1994 г.

**92.** Пытанне аб падтрымцы дзеянняў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, накіраваных на эканамічную інтэграцыю з Расійскай Федэрацыяй, абмяркоўвалася на рэспубліканскім рэферэндуме:

а) 17 сакавіка 1991 г.;
б) 14 мая 1995 г.;
в) 24 лістапада 1996 г.;
г) 17 кастрычніка 2004 г.

**93.** Пытанне аб эканамічнай інтэграцыі Беларусі з Расіяй абмяркоўвалася на рэспубліканскім рэферэндуме:

а) 17 сакавіка 1991 г.;
б) 14 мая 1995 г.;
в) 24 лістапада 1996 г.;
г) 17 кастрычніка 2004 г.

**94.** Пытанне аб устанаўленні новых Дзяржаўнага герба і Дзяржаўнага сцяга Рэспублікі Беларусь абмяркоўвалася на рэспубліканскім рэферэндуме:

а) 17 сакавіка 1991 г.;
б) 14 мая 1995 г.;
в) 24 лістапада 1996 г.;
г) 17 кастрычніка 2004 г.

**95.** А.Р. Лукашэнка быў абраны першым Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь:

а) 27 ліпеня 1990 г.;
б) 15 сакавіка 1994 г.;
в) 10 ліпеня 1994 г.;
г) 24 лістапада 1996 г.

**96.** Пытанне аб адмене ў Рэспубліцы Беларусь смяротнай кары абмяркоўвалася на рэспубліканскім рэферэндуме:

а) 17 сакавіка 1991 г.;
б) 14 мая 1995 г.;
в) 24 лістапада 1996 г.;
г) 17 кастрычніка 2004 г.

**97.** Пагадненне аб спыненні існавання СССР і стварэнні Садружнасці Незалежных Дзяржаў было падпісана:

а) 17 сакавіка 1991 г.;
б) 19 жніўня 1991 г.;
в) 19 верасня 1991 г.;
г) 8 снежня 1991 г.

**98.** Пагадненне аб спыненні існавання СССР і стварэнні Садружнасці Незалежных Дзяржаў было падпісана кіраўнікамі:

а) Латвіі, Літвы і Эстоніі;
б) Грузіі, Арменіі і Азербайджана;
в) Расійскай Федэрацыі, Украіны і Беларусі;
г) Украіны, Беларусі, Малдовы.

**99.** Прадстаўнічым і заканадаўчым органам Рэспублікі Беларусь згодна з Канстытуцыяй з'яўляецца:

а) Нацыянальны сход;
б) Канстытуцыйны Суд;
в) Палата прадстаўнікоў;
г) Савет Міністраў.

**100.** Цэнтральным органам дзяржаўнага кіравання ў Рэспубліцы Беларусь згодна з Канстытуцыяй з'яўляецца:

а) Нацыянальны сход;
б) Савет Рэспублікі;
в) Палата прадстаўнікоў;
г) Савет Міністраў.

**101.** Дагавор аб стварэнні Супольнасці Рэспублікі Беларусь і Расійскай Федэрацыі быў падпісаны:

а) 19 верасня 1991 г.;
б) 8 снежня 1991 г.;
в) 2 красавіка 1996 г.;
г) 2 красавіка 1997 г.

**102.** Пытанне аб прыняцці новай рэдакцыі Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь са змяненнямі і дапаўненнямі абмяркоўвалася на рэспубліканскім рэферэндуме:

а) 17 сакавіка 1991 г.;
б) 14 мая 1995 г.;
в) 24 лістапада 1996 г.;
г) 17 кастрычніка 2004 г.

**103.** Саюз Расіі і Беларусі быў створаны:

а) 8 снежня 1991 г.;
б) 2 красавіка 1996 г.;
в) 24 лістапада 1996 г.;
г) 2 красавіка 1997 г.

**104.** Дагавор паміж Рэспублікай Беларусь і Расійскай Федэрацыяй аб стварэнні Саюзнай дзяржавы быў падпісаны ў:

а) снежні 1991 г.;
б) красавіку 1996 г.;
в) красавіку 1997 г.;
г) снежні 1999 г.

**105.** Папраўка ў Канстытуцыю Рэспублікі Беларусь аб парадку заняцця пасады Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь была ўнесена па выніках рэспубліканскага рэферэндума:

а) 17 сакавіка 1991 г.;
б) 14 мая 1995 г.;
в) 24 лістапада 1996 г.;
г) 17 кастрычніка 2004 г.

*Выберыце правільныя адказы:*

**106.** На рэспубліканскім рэферэндуме 14 мая 1995 г. вырашаліся пытанні аб:

а) захаванні СССР;
б) наданні рускай мове роўнага статусу з беларускай;
в) свабоднай куплі і продажу зямлі;
г) падтрымцы дзеянняў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, накіраваных на эканамічную інтэграцыю з Расійскай Федэрацыяй.

**107.** На рэспубліканскім рэферэндуме 14 мая 1995 г. вырашаліся пытанні аб:

а) прыняцці новай рэдакцыі Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь 1994 г. са змяненнямі і дапаўненнямі;
б) дэнансацыі Дагавора 1922 г. аб утварэнні СССР;
в) наданні рускай мове роўнага статусу з беларускай;
г) устанаўленні новых Дзяржаўнага сцяга і Дзяржаўнага герба Рэспублікі Беларусь.

**108.** На рэспубліканскім рэферэндуме 14 мая 1995 г. беларускі народ падтрымаў прапановы аб:

а) адмене смяротнай кары ў Рэспубліцы Беларусь;
б) падтрымцы дзеянняў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, накіраваных на эканамічную інтэграцыю з Расійскай Федэрацыяй;
в) устанаўленні новых Дзяржаўнага сцяга і Дзяржаўнага герба Рэспублікі Беларусь;
г) новай рэдакцыі 81 артыкула Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь.

**109.** На рэспубліканскім рэферэндуме 24 лістапада 1996 г. вырашаліся пытанні аб:

а) устанаўленні новых Дзяржаўнага сцяга і Дзяржаўнага герба Рэспублікі Беларусь;
б) прыняцці новай рэдакцыі Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь 1994 г. са змяненнямі і дапаўненнямі;

в) наданні рускай мове роўнага статусу з беларускай;
г) свабоднай куплі і продажу зямлі.

**110.** На рэспубліканскім рэферэндуме 24 лістапада 1996 г. вырашаліся пытанні аб:

а) перанясенні Дня незалежнасці Рэспублікі Беларусь на 3 ліпеня;
б) новай рэдакцыі 81 артыкула Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь;
в) адмене смяротнай кары;
г) эканамічнай інтэграцыі Рэспублікі Беларусь з Расійскай Федэрацыяй.

**111.** У адпаведнасці з новай рэдакцыяй Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, прынятай на рэспубліканскім рэферэндуме 24 лістапада 1996 г.:

а) заканадаўчым і прадстаўнічым органам улады ў Рэспубліцы Беларусь з'яўляецца Нацыянальны сход;
б) кіраўніком дзяржавы з'яўляецца Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь;
в) забаронена дзейнасць Камуністычнай партыі Беларусі;
г) створаны Канстытуцыйны Суд.

**112.** На рэспубліканскім рэферэндуме 24 лістапада 1996 г. большасць беларускага народа прагаласавала за:

а) свабодную куплю-продаж зямлі;
б) новую рэдакцыю Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь 1994 г. са змяненнямі і дапаўненнямі, прапанаванымі А.Р. Лукашэнка;
в) новую рэдакцыю Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь 1994 г. са змяненнямі і дапаўненнямі, прапанаванымі дэпутатамі фракцый камуністаў і аграрыяў;
г) перанясенне Дня незалежнасці Рэспублікі Беларусь на 3 ліпеня.

**113.** На рэспубліканскім рэферэндуме 24 лістапада 1996 г. большасць беларускага народа не падтрымала:

а) прыняцце новай рэдакцыі 81 артыкула Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь;
б) адмену смяротнай кары як вышэйшай меры пакарання;
в) эканамічную інтэграцыю Рэспублікі Беларусь з Расійскай Федэрацыяй;
г) свабодную куплю і продаж зямлі.

**114.** Знешнепалітычны курс Рэспублікі Беларусь характарызуецца:

а) абвяшчэннем рэспублікі бяз'ядзернай зонай;
б) мірным урэгуляваннем спрэчак;
в) адмаўленнем працэсу глабалізацыі;
г) развіццём міжнародных адносін толькі з краінамі СНД.

*Запішыце дату (дзень, месяц) святкавання:*

**115.** Дзень незалежнасці Рэспублікі Беларусь у 1991–1996 гг. святкаваўся ..

**116.** Дзень незалежнасці Рэспублікі Беларусь з 1997 г. святкуецца ...

*Запішыце назвы органаў дзяржаўнай улады Рэспублікі Беларусь:*

**117.** Згодна з Канстытуцыяй прадстаўнічым і заканадаўчым органам Рэспублікі Беларусь з'яўляецца …

**118.** Згодна з Канстытуцыяй цэнтральным органам дзяржаўнага кіравання ў Рэспубліцы Беларусь з'яўляецца …

**119.** Згодна з Канстытуцыяй судовая ўлада ў Рэспубліцы Беларусь належыць …

*Запішыце назвы гістарычных тэрмінаў:*

**120.** Незалежнасць і самастойнасць дзяржавы ва ўнутранай і знешняй палітыцы – гэта …

**121.** Усенароднае галасаванне па найважнейшых пытаннях развіцця краіны – гэта …

**122.** Дзяржава, у якой рэалізаваны прынцыпы вяршэнства законаў, падзелу ўлад на заканадаўчую, выканаўчую, судовую, называецца …

**123.** Дзяржава, у якой кожнаму чалавеку гарантаваны годны ўзровень жыцця, створаны ўмовы для рэалізацыі канстытуцыйных правоў на працу, сацыяльнае забеспячэнне, адукацыю, ахову здароўя і інш., называецца …

**124.** Форма дзяржаўнага будаўніцтва, пры якой тэрыторыя дзяржавы не мае ў сваім складзе федэратыўных адзінак, называецца …

*Пастаўце ў правільнай храналагічнай паслядоўнасці гістарычныя падзеі:*

**125.** а) абмеркаванне пытання аб пераносе Дня незалежнасці Рэспублікі Беларусь; б) выбары першага Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь; в) Дэкларацыя аб дзяржаўным суверэнітэце БССР; г) абмеркаванне на рэферэндуме пытання аб устанаўленні новых Дзяржаўнага герба і Дзяржаўнага сцяга Рэспублікі Беларусь;

**126.** а) абмеркаванне пытання аб новай рэдакцыі Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь 1994 г. са змяненнямі і дапаўненнямі; б) увядзенне новай назвы дзяржавы «Рэспубліка Беларусь»; в) абмеркаванне на рэферэндуме пытання аб статусе рускай мовы; г) прыняцце Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь;

**127.** а) пагадненне аб спыненні існавання СССР; б) абвяшчэнне ў СССР курса на паскарэнне сацыяльна-эканамічнага развіцця; в) прыняцце Закона аб новай назве дзяржавы «Рэспубліка Беларусь»; г) прыняцце Дэкларацыі аб дзяржаўным суверэнітэце БССР;

**128.** а) прыняцце Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь; б) прыняцце Дэкларацыі аб дзяржаўным суверэнітэце БССР; в) Першы Усебеларускі народны сход; г) выбранне першым Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь А.Р. Лукашэнка;

**129.** а) падпісанне Дагавора аб стварэнні Супольнасці Рэспублікі Беларусь і Расійскай Федэрацыі; б) стварэнне ЕўрАзЭС; в) падпісанне Дагавора аб стварэнні Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі; г) падпісанне Дагавора аб Саюзе Беларусі і Расіі

*Суаднясіце элементы двух мностваў:*

**130.**

| | |
|---|---|
| 1. Дэкларацыя аб дзяржаўным суверэнітэце БССР | а) замацаванне раўнапраўя рускай і беларускай моў |
| 2. Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь у рэдакцыі, прынятай 24 лістапада 1996 г. | б) абмеркаванне пытання аб свабоднай куплі і продажу зямлі |
| 3. Рэспубліканскі рэферэндум 14 мая 1995 г. | в) абмеркаванне пытання аб статусе рускай мовы |
| 4. Рэспубліканскі рэферэндум 24 лістапада 1996 г. | г) абвяшчэнне незалежнасці рэспублікі |

**131.**

| | |
|---|---|
| 1. Рэферэндум 14 мая 1995 г. | а) абмеркаванне пытання аб наданні рускай мове роўнага статусу з беларускай |
| 2. Рэферэндум 24 лістапада 1996 г. | б) папраўка ў змесце 81 артыкула Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь |
| 3. Рэферэндум 17 кастрычніка 2004 г. | в) абмеркаванне пытання аб перанясенні Дня незалежнасці Рэспублікі Беларусь |
| 4. Рэферэндум 17 сакавіка 1991 г. | г) абмеркаванне пытання аб захаванні СССР |

## ВЫНІКОВЫ КАНТРОЛЬ

*Выберыце правільныя адказы:*

**132.** Для пасляваеннага аднаўлення гаспадаркі БССР былі характэрны:

а) пераважнае развіццё цяжкай прамысловасці;
б) дапамога краін Заходняй Еўропы;
в) дапамога савецкіх рэспублік;
г) пераход да хутарской сістэмы ў сельскай гаспадарцы.

**133.** Для эканамічнага развіцця БССР у другой палове 1950-х – першай палове 1980-х гг. былі характэрны:

а) паступовае фарміраванне індустрыяльнага грамадства;
б) інтэнсіўны шлях развіцця;
в) пераважнае развіццё лёгкай прамысловасці;
г) узнікненне новых галін вытворчасці (нафтаперапрацоўкі, радыёэлектронікі, хімічнай прамысловасці).

**134.** Для эканамічнага развіцця БССР у другой палове 1950-х – першай палове 1980-х гг. былі характэрны:

а) пераход ад каманднa-адміністрацыйных да рыначных метадаў кіравання;
б) экстэнсіўны шлях развіцця;
в) разгортванне навукова-тэхнічнай рэвалюцыі пераважна ў абарончай прамысловасці;
г) эканамічны суверэнітэт у складзе СССР.

**135.** Гаспадарчая рэформа 1965 г. прадугледжвала:

а) скарачэнне планавых паказчыкаў, якія вызначала прадпрыемству дзяржава;

б) увядзенне гаспадарчага разліку;

в) ліквідацыю каманднa-адміністрацыйнай сістэмы кіравання;

г) стварэнне саўнаргасаў.

**136.** Для эканамічнага развіцця БССР у другой палове 1950-х – першай палове 1980-х гг. былі характэрны:

а) паступовае фарміраванне індустрыяльнага грамадства;

б) інтэнсіўны шлях развіцця;

в) пераважнае развіццё харчовай прамысловасці;

г) захаванне цэнтралізаванага планавага кіравання.

**137.** Для эканамічнага развіцця БССР у другой палове 1950-х – першай палове 1980-х гг. былі характэрны:

а) хуткае развіццё рыначнай эканомікі;

б) экстэнсіўны шлях развіцця;

в) пераважнае развіццё цяжкай прамысловасці;

г) эканамічны суверэнітэт у складзе СССР.

**138.** Для эканамічнага развіцця БССР у другой палове 1950-х – першай палове 1980-х гг. былі характэрны:

а) паступовае разгортванне навукова-тэхнічнай рэвалюцыі;

б) інтэнсіўны шлях развіцця;

в) узнікненне новых галін вытворчасці (нафтаперапрацоўчай, хімічнай прамысловасці, радыёэлектронікі);

г) адмова ад каманднa-адміністрацыйных метадаў кіравання.

**139.** Эканамічнае развіццё БССР у першай палове 1980-х гг. характарызавалася:

а) зніжэннем тэмпаў эканамічнага росту;

б) узрастаннем дэфіцыту тавараў першай неабходнасці;

в) пераводам эканомікі на рыначныя адносіны;

г) інтэнсіўным шляхам развіцця.

**140.** Для грамадска-палітычнага развіцця БССР у другой палове 1940-х гг. – першай палове 1980-х гг. былі характэрны:

а) захаванне аднапартыйнай сістэмы;

б) выбары ў Саветы народных дэпутатаў на альтэрнатыўнай аснове;

в) фарміраванне шматпартыйнасці;
г) замацаванне кіруючай ролі КПБ у Канстытуцыі БССР.

**141.** Прыкметамі палітыкі «перабудовы» ў палітычнай сістэме БССР у другой палове 1980-х гг. з'яўляліся:

а) галоснасць;
б) фарміраванне двухпалатнага Нацыянальнага сходу;
в) фарміраванне шматпартыйнасці;
г) абвяшчэнне дзяржаўнага суверэнітэту рэспублікі.

**142.** На рэспубліканскім рэферэндуме 14 мая 1995 г. вырашаліся пытанні аб:

а) адмене смяротнай кары ў Рэспубліцы Беларусь;
б) наданні рускай мове роўнага статусу з беларускай;
в) свабоднай куплі і продажу зямлі;
г) устанаўленні новых Дзяржаўнага сцяга і Дзяржаўнага герба Рэспублікі Беларусь.

**143.** На рэспубліканскім рэферэндуме 24 лістапада 1996 г. вырашаліся пытанні аб:

а) устанаўленні новых Дзяржаўнага сцяга і Дзяржаўнага герба Рэспублікі Беларусь;
б) прыняцці Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь 1994 г. са змяненнямі і дапаўненнямі;
в) наданні рускай мове роўнага статусу з беларускай;
г) свабоднай куплі і продажу зямлі.

**144.** На рэспубліканскім рэферэндуме 24 лістапада 1996 г. вырашаліся пытанні аб:

а) перанясенні Дня незалежнасці Рэспублікі Беларусь;
б) новай рэдакцыі 81 артыкула Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь;
в) адмене смяротнай кары як вышэйшай меры пакарання;
г) эканамічнай інтэграцыі Рэспублікі Беларусь з Расійскай Федэрацыяй.

**145.** Знешнепалітычны курс Рэспублікі Беларусь характарызуецца:

а) непрымяненнем сілы і пагрозы сілай;
б) шматвектарнасцю знешніх адносін;
в) адмаўленнем працэсу глабалізацыі;
г) аказаннем ваеннай дапамогі краінам – удзельнікам ваенных канфліктаў.

*Суаднясіце элементы двух мностваў:*

**146.**

| | |
|---|---|
| 1) 25 жніўня 1991 г. | а) абвяшчэнне Дэкларацыі аб дзяржаўным суверэнітэце БССР |
| 2) 10 ліпеня 1994 г. | б) зацвярджэнне новай назвы нашай краіны «Рэспубліка Беларусь» |
| 3) 27 ліпеня 1990 г. | в) Закон аб наданні канстытуцыйнага статусу Дэкларацыі аб дзяржаўным суверэнітэце БССР |
| 4) 19 верасня 1991 г. | г) абранне А.Р. Лукашэнка першым Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь |

**147.**

| | |
|---|---|
| 1) 15 сакавіка 1994 г. | а) прыняцце Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь |
| 2) 14 мая 1995 г. | б) пагадненне аб спыненні існавання СССР і стварэнні Садружнасці Незалежных Дзяржаў |
| 3) 24 лістапада 1996 г. | в) першы рэспубліканскі рэферэндум |
| 4) 8 снежня 1991 г. | г) другі рэспубліканскі рэферэндум |

**148.**

| | |
|---|---|
| 1) 17 кастрычніка 2004 г. | а) папраўка ў Канстытуцыю Рэспублікі Беларусь аб парадку заняцця пасады Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь |
| 2) 2 красавіка 1996 г. | б) Дагавор паміж Рэспублікай Беларусь і Расійскай Федэрацыяй аб стварэнні Саюзнай дзяржавы |
| 3) 2 красавіка 1997 г. | в) Дагавор аб стварэнні Супольнасці Рэспублікі Беларусь і Расійскай Федэрацыі |
| 4) 8 снежня 1999 г. | г) стварэнне Саюза Расіі і Беларусі |

**149.**

| | |
|---|---|
| 1) П. Панамарэнка | а) Першы сакратар ЦК КПБ у 1956–1965 гг. |
| 2) К. Мазураў | б) Першы сакратар ЦК КП(б)Б у 1938–1947 гг. |
| 3) П. Машэраў | в) Першы сакратар ЦК КПБ у 1965–1980 гг. |
| 4) С. Прытыцкі | г) Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР у 1968–1971 гг. |

**150.**

| | |
|---|---|
| 1) «Альпійская балада» | а) Я. Колас |
| 2) «На ростанях» | б) В. Быкаў |
| 3) «Палеская хроніка» | в) У. Караткевіч |
| 4) «Каласы пад сярпом тваім» | г) І. Мележ |

**151.**

| | |
|---|---|
| 1) манумент у гонар савецкай маці-патрыёткі ў Жодзіне | а) М. Савіцкі |
| 2) мемарыяльны комплекс «Хатынь» | б) А. Заспіцкі, І. Міско, М. Рыжанкоў |
| 3) цыкл карцін «Лічбы на сэрцы» | в) Ю. Семяняка |
| 4) «Зорка Венера» | г) С. Селіханаў |

**152.**

| | |
|---|---|
| 1) дзеячы навукі | а) Н. Сакалоўскі, М. Клімковіч |
| 2) касманаўты | б) У. Алоўнікаў, С. Картэс |
| 3) аўтары Дзяржаўнага гімну БССР «Мы – беларусы» | в) А. Жэбрак, В. Купрэвіч |
| 4) кампазітары | г) П. Клімук, У. Кавалёнак |

*Запішыце назвы гістарычных тэрмінаў:*

**153.** Палітычны кірунак, пры якім воля кіруючай асобы лічыцца вызначальнай асновай грамадскага развіцця, называецца …

**154.** Шлях развіцця эканомікі, пры якім павелічэнне колькасці выпускаемай прадукцыі дасягаецца за кошт росту колькасці працуючых, станкоў, прадпрыемстваў, называецца …

**155.** Шлях развіцця эканомікі, пры якім павелічэнне колькасці выпускаемай прадукцыі дасягаецца за кошт укаранення дасягненняў навукі і тэхнікі, павелічэння прадукцыйнасці працы, называецца …

**156.** Рэфармаванне палітычнай і сацыяльна-эканамічнай сістэмы СССР, ініцыятарам якой выступіў Генеральны сакратар ЦК КПСС М.С. Гарбачоў, атрымала назву …

**157.** Аднаўленне добрага імя і правоў нявінна асуджаных – гэта …

**158.** Карэнныя змены вытворчасці, якія адбываюцца ў выніку ператварэння навукі ў непасрэдную вытворчую сілу, укаранення навуковых дасягненняў у вытворчасць – гэта …

**159.** Незалежнасць і самастойнасць дзяржавы ва ўнутранай і знешняй палітыцы называецца …

**160.** Усенароднае галасаванне па найважнейшых пытаннях развіцця краіны – гэта …

**161.** Дзяржава, у якой рэалізаваны прынцыпы вяршэнства законаў, падзелу ўлад на заканадаўчую, выканаўчую, судовую, называецца …

**162.** Дзяржава, у якой кожнаму чалавеку гарантаваны годны ўзровень жыцця, створаны ўмовы для рэалізацыі канстытуцыйных правоў на працу, сацыяльнае забеспячэнне, адукацыю, ахову здароўя і інш., называецца …

**163.** Форма дзяржаўнага будаўніцтва, пры якой тэрыторыя дзяржавы не мае ў сваім складзе федэратыўных адзінак, называецца …

*Пастаўце ў правільнай храналагічнай паслядоўнасці гістарычныя падзеі:*

**164.** а) прыняцце ў Беларусі Закона аб уласнасці; б) аварыя на Чарнобыльскай АЭС; в) прыняцце ў Беларусі Закона «Аб сялянскай (фермерскай) гаспадарцы»; г) абвяшчэнне курсу на паскарэнне сацыяльна-эканамічнага развіцця ў СССР;

**165.** а) прыняцце рашэння аб часовым прыпыненні дзейнасці КПСС – КПБ на тэрыторыі Беларусі; б) прыняцце Дэкларацыі аб дзяржаўным суверэнітэце Беларускай ССР; в) пагадненне аб спыненні існавання СССР; г) прыняцце Закона аб змене назвы БССР на назву «Рэспубліка Беларусь»;

**166.** а) пагадненне аб стварэнні Садружнасці Незалежных Дзяржаў (СНД); б) рэферэндум па пытанні аб захаванні СССР; в) выбранне першым Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь А.Р. Лукашэнка; г) прыняцце Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь;

**167.** а) рэспубліканскі рэферэндум па пытаннях аб змене дзяржаўнай сімволікі і статусе рускай мовы; б) прыняцце Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь; в) рэспубліканскі рэферэндум па пытанні аб новай рэдакцыі Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь 1994 г.; г) прыняцце Закона аб змене назвы БССР на назву «Рэспубліка Беларусь»;

**168.** а) рэферэндум па пытанні аб захаванні СССР; б) прыняцце Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь; в) падпісанне Дагавора аб стварэнні Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі; г) рэспубліканскі рэферэндум па пытанні аб унясенні папраўкі ў 81 артыкул Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь;

**169.** а) пачатак пасляваеннага аднаўлення народнай гаспадаркі БССР; б) першая пасляваенная пяцігодка; в) гаспадарчая рэформа, згодна з якой памяншалася колькасць планавых паказчыкаў для прадпрыемстваў; г) прыняцце ў Беларусі Закона «Аб сялянскай (фермерскай) гаспадарцы»;

**170.** а) аварыя на Чарнобыльскай АЭС; б) пераход БССР да ўсеагульнай сярэдняй адукацыі; в) стварэнне Саюза Беларусі і Расіі; г) рэспубліканскі рэферэндум па пытанні аб унясенні папраўкі ў 81 артыкул Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь;

**171.** а) прыняцце Дэкларацыі аб дзяржаўным суверэнітэце БССР; б) рэспубліканскі рэферэндум па пытанні аб пераносе Дня незалежнасці Рэспублікі Беларусь; в) рэспубліканскі рэферэндум па пытанні аб статусе рускай мовы; г) чацвёрты Усебеларускі народны сход.

## РОЗНАЎЗРОЎНЕВЫЯ ЗАДАННІ

### Раздзел 1. БССР у другой палове 1940-х – першай палове 1950-х гг.

*1 узровень*

**1.** У пераліку гістарычных паняццяў вызначце тыя, якія характарызуюць развіццё БССР у другой палове 1940-х – першай палове 1950-х гг.:

а) калектывізацыя;
б) метад сацыялістычнага рэалізму;
в) новая эканамічная палітыка;
г) палітыка «ваеннага камунізму».

**2.** У пераліку гістарычных паняццяў вызначце тыя, якія характарызуюць развіццё БССР у другой палове 1940-х – першай палове 1950-х гг.:

а) індустрыялізацыя; в) рэпатрыяцыя;
б) беларусізацыя; г) «прышчэпаўшчына».

**3.** У пераліку гістарычных асоб вызначце тыя, дзейнасць якіх адносіцца да другой паловы 1940-х – першай паловы 1950-х гг.:

а) М. Галадзед; в) П. Панамарэнка;
б) К. Ландар; г) В. Казлоў.

**4.** У пераліку гістарычных асоб вызначце тыя, дзейнасць якіх адносіцца да другой паловы 1940-х – першай паловы 1950-х гг.:

а) А. Мяснікоў; в) С. Прытыцкі;
б) У. Пічэта; г) В. Купрэвіч.

*2 узровень*

**1.** Дайце азначэнні паняццяў:

а) метад сацыялістычнага рэалізму, рэпарацыі;
б) рэпатрыяцыя; прынцып партыйнасці.

**2.** Чым вядомы ў гісторыі Беларусі:

а) П. Панамарэнка, В. Казлоў;
б) В. Купрэвіч, Р. Шырма.

**3.** Назавіце асноўныя тэмы творчасці беларускіх пісьменнікаў, паэтаў, мастакоў, драматургаў у першае пасляваеннае дзесяцігоддзе.

**4.** Назавіце два прозвішчы беларусаў – дзеячаў культуры і навукі другой паловы 1940-х – першай паловы 1950-х гг. Назавіце адзін з іх твораў (навуковыя дасягненні):

а) пісьменнікі; в) архітэктары;
б) мастакі; г) вучоныя.

*3 узровень*

**1.** Як змянілася галіновая структура прамысловасці Беларусі ў першае пасляваеннае дзесяцігоддзе?

**2.** Чым было абумоўлена пераважнае развіццё цяжкай прамысловасці ў БССР у першае пасляваеннае дзесяцігоддзе?

**3.** Назавіце асноўныя рысы грамадска-палітычнай сістэмы БССР у першае пасляваеннае дзесяцігоддзе.

**4.** Якую ролю ў грамадска-палітычнай сістэме БССР у першае пасляваеннае дзесяцігоддзе выконвалі:

4.1. Камуністычная партыя (бальшавікоў).
4.2. Саветы дэпутаў працоўных.
4.3. Прафсаюзы.
4.4. Камсамол.

**5.** Растлумачце, чаму ў першае пасляваеннае дзесяцігоддзе асаблівая ўвага надавалася падрыхтоўцы інжынерных кадраў.

*4 узровень*

**1.** Ахарактарызуйце развіццё беларускага грамадства ў першае пасляваеннае дзесяцігоддзе. Запоўніце табліцу.

| | |
|---|---|
| Эканамічная сфера | |
| Палітычная сфера | |
| Сацыяльная сфера | |
| Духоўная сфера | |

**2.** Параўнайце працэсы аднаўлення гаспадаркі БССР пасля грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў па прапанаваных крытэрыях. Вызначце агульнае і адметнае. Чым тлумачыліся адрозненні ў працэсах аднаўлення народнай гаспадаркі БССР у 1920-я і 1940-я гг.?

| Крытэрыі для параўнання | Аднаўленне гаспадаркі пасля грамадзянскай вайны (1921–1926 гг.) | Аднаўленне гаспадаркі пасля Вялікай Айчыннай вайны (1943–1955 гг.) |
|---|---|---|
| Тэрыторыя, на якой праходзіў працэс аднаўлення | | |
| Знешнепалітычныя ўмовы працэсу аднаўлення | | |
| Галіны эканомікі, якія аднаўляліся ў першую чаргу | | |
| Эканамічная сістэма | | |

**3.** Ахарактарызуйце эканамічнае развіццё БССР у другой палове 1940-х – першай палове 1950-х гг. Чым былі абумоўлены поспехі і цяжкасці ў развіцці эканомікі БССР у першае пасляваеннае дзесяцігоддзе?

| | Прамысловасць | Сельская гаспадарка |
|---|---|---|
| Поспехі ў аднаўленні гаспадаркі | | |
| Цяжкасці ў эканамічным развіцці | | |

**4.** Ахарактарызуйце развіццё адукацыі, навукі, літаратуры і мастацтва ў БССР у другой палове 1940-х – першай палове 1950-х гг. Чым былі абумоўлены поспехі і цяжкасці ў развіцці адукацыі, навукі і культуры ў БССР у першае пасляваеннае дзесяцігоддзе?

| | Адукацыя | Навука | Літаратура і мастацтва |
|---|---|---|---|
| Дасягненні | | | |
| Цяжкасці ў развіцці | | | |

**5.** Устанавіце прычынна-выніковыя сувязі паміж гістарычнымі фактамі: развіццё адукацыі і навукі ў БССР (1945–1955 гг.) і станаўленне індустрыяльнага грамадства.

### *5 узровень*

**1.** Сістэматызуйце прозвішчы гістарычных дзеячаў па самастойна вызначаных крытэрыях:

П. Панамарэнка, В. Казлоў, А. Грамыка, В. Купрэвіч, Р. Шырма, М. Лынькоў, І. Шамякін, П. Броўка, М. Танк, А. Куляшоў, Я. Цікоцкі, А. Багатыроў, Дз. Лукас, Г. Глебаў, Б. Платонаў, С. Станюта, Я. Зайцаў, У. Сухаверхаў, В. Волкаў.

**2.** Пасля вызвалення БССР ад германскіх захопнікаў ЦК ВКП(б) і СНК СССР прынялі шэраг пастаноў, накіраваных на аднаўленне народнай гаспадаркі рэспублікі. Сярод іх:

- Пастанова ЦК ВКП(б) і СНК СССР «Аб неадкладных мерах па аднаўленні гаспадаркі ў раёнах, вызваленых ад нямецкай акупацыі» (21.08.1943 г.);

- Пастанова СНК СССР і ЦК ВКП(б) «Аб аказанні дапамогі вызваленным раёнам Віцебскай, Магілёўскай, Гомельскай і Палескай абласцей БССР па аднаўленні МТС і калгасаў» (27.12.1943 г.);
- Пастанова СНК СССР «Аб аказанні дапамогі Беларускай ССР па забеспячэнні насельніцтва харчовымі і прамысловымі таварамі» (22.08.1944 г.);
- Пастанова Савета Міністраў СССР і ЦК ВКП(б) «Аб мерах па ліквідацыі парушэнняў Статута сельскагаспадарчай арцелі ў калгасах» (19.09.1946 г.).

Як вы лічыце:

а) чым было абумоўлена з'яўленне гэтых нарматыўных актаў?

б) якую ролю яны адыгралі ў аднаўленні сельскай гаспадаркі БССР? Абгрунтуйце сваё меркаванне.

**3.** Замежныя эканамісты прагназавалі 25-гадовы тэрмін аднаўлення народнай гаспадаркі СССР пасля Вялікай Айчыннай вайны. У БССР даваенны ўзровень прамысловасці быў адноўлены да 1950 г. У чым вы бачыце прычыны гэтага? Сваю думку абгрунтуйце.

**4.** Параўнайце развіццё БССР у 1930-я гг. і 1945–1955 гг. Што змянілася ў беларускім грамадстве ў параўнанні з даваенным перыядам? Чым былі абумоўлены гэтыя змены?

| Пытанні для параўнання | БССР у 1930-я гг. | БССР у 1945–1955 гг. |
|---|---|---|
| Эканамічная сфера | | |
| Палітычная сфера | | |
| Сацыяльная сфера | | |
| Духоўная сфера | | |

